Бальшавіцкае прывітаньне змагаром за перамогу сацыялізму— дэлегатам усебеларускага настаўніцкага зьезду

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 44 (3948)
НЯДЗЕЛЯ, 15 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬМЕРАПЫННА

У радох актыўных змагароў за перамогу сацыялізму

Трэці настаўніцкі ўсебеларускі зьезд, які адкрываецца сёньня, мае асаблівае значэньне таму, што ён адбываецца ў пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы, калі рабочая кляса і працоўныя масы БССР, уступіўшы ў трэці рашаючы год пяцігодкі, пад кіраўніцтвам партыі напружваюць усе сілы, каб ажыцьцявіць задачу завяршэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, калі асабліва стала рэальнай небясьпека ваеннага нападу капіталістаў на СССР і ў першую чаргу на яго фарпост—БССР.

Настаўніцкі зьезд склікаецца ў момант, калі рабочая кляса, калгасьнікі, бядняцка-сераднякія масы сялянства і працоўная інтэлігенцыя пад кіраўніцтвам партыі ажыцьцяўляюць лёзунгі культурнай рэвалюцыі, будуюць нацыянальную сацыялістычную культуру.

Прамежак часу паміж другім і трэцім настаўніцкімі зьездамі характэрны вялізарнымі сацыяльна-эканамічнымі зрухамі, якія адбыліся ў нашай краіне. Гэтыя зрухі выяўляюцца ў тым, што асноўныя гаспадарчыя вагары знаходзяцца ў руках сацыялістычнага сэктару, што лёзунг «хто каго» ў прамысловасьці канчаткова вырашан на карысьць сацыялізму. Значна ўзмацніліся і пашырыліся апора партыі на вёсцы—армія калгасьнікаў выраслa ў СССР да 123.754 гаспадарак, у наяўнасьці вялікі калгасны ўздым бядняцка-сераднякіх мас сялянства, ажыцьцяўляецца лёзунг суцэльнай калектывізацыі і на ня аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Гэтыя зрухі глыбока закранулі масы настаўніцтва, значна зьмянілі яго твар. Разам з колькасным ростам (каля 2-х дзесяткаў тысяч) адбыліся відавочныя зьмены ў бок якаснага паляпшэньня настаўніцкіх радоў. Паглыбленая палітычная дыфэрэнцыяцыя настаўніцтва, якая адбывалася на фоне агульнага абвастраньня клясавай барацьбы, усё больш вырышталізоўвала два полюсы: згуртоўвала асноўныя масы настаўніцтва пад лёзунгамі партыі, выяўляючы і ізалюючы частку—праўда, зусім нязначную,—якая ў тэй ці іншай форме праводзіць варожую партыі лінію. Рашучая лінія на падрыхтоўку савецкага педагога забясьпечыла значныя зрухі сярод настаўніцтва ў бок павялічэньня партыйна-камсамольскай праслойкі і праслойкі выхадцаў з пралетарскага, бядняцка-сераднякага асяродзьдзя.

Самае важнае, што характарызуе твар асноўных мас настаўніцтва, заключаецца ў тым, што сёньняшні настаўнік—ня толькі педагог. Такое разуменьне аджыло свой час. Яно не адпавядае пэрыяду разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце.

Аўтарытэт настаўніка, асабліва вясковага, сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякага сялянства мерыцца тым, як ён (настаўнік) злучае сваю работу ў школе з актыўным удзелам у будаўніцтве сацыялізму. Сёньняшні настаўнік—гэта актывіст, змагар за калектывізацыю, за індустрыялізацыю, дэпутат у саветы, памочнік партыі.

Таму з асаблівай рашучасьцю неабходна і надалей ачышчаць настаўніцкія рады ад пасобных элемэнтаў, якія прымазаліся, тым больш неабходна, калі мець на ўвазе факты, выяўленыя ў сувязі з арыштам групы беларускіх контр-рэвалюцыйных нацдэмаў, імкненьні асобных «настаўнікаў» (Расна) стварыць у школе апорныя пункты контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўскай работы.

Імкненьням беларускіх контр-рэвалюцыйных нацдэмаў пашырыць свой уплыў сярод асьвятніцкіх колаў асноўныя масы савецкага настаўніцтва далі рэшучы адпор.

Асноўныя масы настаўніцтва пад кіраўніцтвам партыі вядуць вялікую работу па растлумачэньні ідэалёгічнай сутнасьці нацдэмаўскіх тэорый, па будаўніцтве, культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце.

Лінія партыі і практычная работа па разгортваньні масавай работы сярод працоўнай інтэлігенцыі забясьпечылі антыўнае змаганьне асноўных мас настаўніцтва за ажыцьцяўленьне баявых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Вясковае настаўніцтва праводзіць энергічную работу па арганізацыі беднаты, разгортваньні калектывізацыі, па падрыхтоўцы да бальшавіцкай сяўбы і г.д. Настаўніцтва праводзіць сапраўды вялікую работу па зьнішчэньні найбольш цяжкай спадчыны царызму—ліквідацыю няпісьменнасьці, і перабудову школ на політэхнічныя рэйкі.

Можна падаць дасягненьні фактаў гэрэічнага змаганьня настаўнікаў за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, за будаўніцтва сапраўднай савецкай школы.

«Зьвязда» за апошнія часы паказала не адзін факт цікавага ўдзелу кулацкіх элемэнтамі лепшых настаўнікаў-актывістаў на вёсцы. Такіх фактаў шмат. Кулацкі тэрор, цкаваньне, пратэст кулакоў і падкулачнікаў супроць політэхнізацыі школы з практычнай вучняў у калгасах—усё гэта зьвеньні агульнай разгорнутай клясавай барацьбы, у гарне якой загартоўваецца савецкі настаўнік-актывіст.

У сьвятле гэтых фактаў зварачаюць на сябе ўвагу пасобныя моманты пасыўных адносін, а часамі і простага патураньня кулакоў у яго цкаваньні настаўнікаў-актывістаў, што мела месца ў Царавуцах (Случчына) з боку савецкіх арганізацый і нават пасобных партыйных ячэек.

Справа выхаваньня падрастаючага пакаленьня ў камуністычным духу, справа падрыхтоўкі настолькі патрэбных сацыялістычнаму будаўніцтву кадраў—зьяўляецца важнейшым і рашаючым вучасткам нашай работы. Таму ўвага, клопаты партыйных, савецкіх, прафсаюзных арганізацый аб паляпшэньні матар'яльнага становішча, стварэньні найлепшых умоў работы, барацьба з кулакімі і варожымі элемэнтамі, якія імкнуцца ашальмаваць настаўніка-актывіста,—ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗНАЧНА ЎЗМОЦНЕНЫ.

Настаўніцтва Беларусі да трэцяга зьезду прыходзіць узбагачаным практычнай работы імкненьня ў пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі. Трэці зьезд, палітычнае значэньне якога відавочна, павінен будзе падагуліць гэту практыку і вызначыць цэлы рад мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі яшчэ большую мабілізацыю мас настаўніцтва для бальшавіцкай работы на важнейшых вучастках сацыялістычнай будоўлі.

Падрыхтоўка патрэбных сацыялістычнаму будаўніцтву кадраў, перабудова савецкай школы на сапраўды політэхнічнай аснове, выхаваньне маладога пакаленьня ў камуністычным духу, рашучае ажыцьцяўленьне пляну ўсеагульнага навучаньня, выкананьне дырэктыў партыі і ўраду ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці, бязьлітасная барацьба з буржуазнымі плянамі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве і ў першую чаргу барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў—вось рашаючыя задачы культурнай рэвалюцыі, якія займаюць важнейшае месца ў агульным наступленьні сацыялізму па ўсім фронце. Абмеркаваньне шляхоў лепшага і хутчэйшага вырашэньня гэтых задач з найбольшай мабілізацыяй сіл настаўніцкіх мас павінна заняць асноўнае месца ў рабоце зьезду.

Сваімі пастановамі зьезд павінен будзе забясьпечыць яшчэ больш энэргічную работу настаўніцкіх мас у галіне агульнай барацьбы за завяршэньне пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, за арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва ў школе, калгасе, за правядзеньне бальшавіцкай сяўбы, за разгортваньне ўдарнымі тэмпамі калгаснага будаўніцтва і ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Прысутнасьць на зьезьдзе 50 дэлегатаў-ударнікаў рабочых і калгасьнікаў і прадстаўнікоў брацкіх нацыянальных рэспублік павінна быць з усёй пачэсьцю выкарыстана для перанясьненьня лепшай практыкі ўдарнай работы ў барацьбу настаўніцтва разам з пралетарыятам і ўсімі працоўнымі пад кіраўніцтвам партыі за канчатковую перамогу сацыялізму.

Вынікі 2-га зьезду Асоавіяхіму

Мы ўступілі ў пэрыяд нарастаньня ваеннай небясьпекі. Гэта добра разумеў склад 2-га ўсебеларускага зьезду Асоавіяхіму. Натуральна, гэта становішча знайшло сваё адлюстраваньне ў пастановах зьезду.

З чым прышоў беларускі Асоавіяхім да свайго 2-га зьезду?

Асноўныя дасягненьні—арганізацыя прымала актыўны ўдзел над кіраўніцтвам партыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, за выкананьне і перавыкананьне вялікага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, дапамагала партыі і савецкай уладзе з посьпехам вырашаць і праводзіць рад важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Арганізацыя прышла да 2-га зьезду больш чым у два разы павялічыўшы свае рады, маючы значнае павялічэньне ўдзельнай вагі беднаты і калгасьнікаў — нашай апоры ў вёсцы. Разгарнуўшы ваенную работу, беларускі Асоавіяхім дабіўся ёсьці ў стрэлковай справе, шырока паставіў справу процівапаветранай абароны. Ёсьць вялікі рост хімзатрадаў.

Дасягі пасьпяхова беларускі Асоавіяхім правёў такія важныя кампаніі, як «дзень дырыжабля». Правёў рэальную дапамогу сельскай гаспадарцы ў барацьбе са шкодзікамі, падрыхтаваўшы з ліку працоўных сялян кадры для гэтай справы.

Базумоўна, у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і дапамогі сацыялістычнаму будаўніцтву арганізацыя пад кіраўніцтвам партыі дабілася істотных посьпехаў.

Аднак, гэтыя дасягненьні зьяўляюцца далёка невыстарчальнымі параўнальна з тымі вялізарнейшымі посьпехамі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, з бурным ростам энтузіязму шырокіх рабочых і асноўных мас сялянства. Арганізацыя поўнасьцю ня здолела выкарыстаць вялізарнейшы размах творчай актыўнасьці мас, ня здолела тэмпы сваёй работы падцягнуць да ўзроўню тэмпаў, узятых рабочай клясай у выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, у выкананьні генэральнай лініі партыі па індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны.

Арганізацыя спазьнілася з рэканструкцыяй таварыства, не пасьпявала зь навышанымі патрабаваньнямі ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Рэзалюцыя аб'яднанага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК гаворыць, што:

«У гэтых умовах абвостранай клясавай барацьбы патрабуецца максымальная мабілізацыя творчых сіл рабочай клясы, калгасьнікаў і ўсіх працоўных на перамаганьне труднасьцяй, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, на шляху ажыцьцяўленьня лёзунгу: «Пяцігодка — за чатыры гады». Імкненьні ў гэтых умовах патрабуецца ад нас максымальнае напружаньне сіл для далейшага разгортваньня індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнага будаўніцтва, для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны».

Гэта і вызначае далейшыя задачы Асоавіяхіму.

Першае і асноўнае — гэта жорсткая барацьба за генэральную лінію партыі супроць усіх уходаў і праяўленьняў апартунізму, за абсалютную чыстату палітычнай лініі арганізацыі, за клясавую чыстату не радою, супроць дзяльцтва і недасьведчанасьці палітычных задач у рабоце Асоавіяхіму.

Беларускі Асоавіяхім павінен павярнуцца тварам да задач рэканструкцыйнага пэрыяду, вырашыць свае вытворчыя задачы, і пастановы зьезду гаворыць аб тым, што гэты паварот будзе завершан.

«Зьезд адзначае, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — што тэмпы работы асоавіяхімаўскіх арганізацый усё яшчэ адстаюць ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва яшчэ ня ўсюды зьявіліся штодзённым рухавіком практычнай дзейнасьці таварыства, невыстарчальна разгорнута крытыка і самакрытыка. У сувязі з гэтым зьезд даручае ўзяць суровы курс на ўзмацненьне такіх тэмпаў, якія-б забясьпечвалі напажную пастаноўку ваеннай прапаганды, садзейнасьць сацыялістычнаму будаўніцтву БССР і СССР і вялізарнай працоўных, праводзячы ўсю работу мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва пад знакам здаровай крытыкі і самакрытыкі».

Асоавіяхім павінен шпарка і гібка здолець спалучыць свае ваенна-абаронныя задачы з дапамогай сельскагаспадарчай будоўлі, з удзелам ва ўсіх асноўных гаспадарча-палітычных кампаніях, якія праводзяцца партыяй і савецкай уладай.

Вялізарнейшае значэньне для Асоавіяхіму мае пяцігодка таварыства, якую зьезд лічыць неабходным давесьці да ячэйкі, згуртаваць усе сілы і сродкі на яе выкананьне, забясьпечыць выпіскі і якасьць работы.

Адначасова зьезд на аснове вялізарнага росту энэргіі ў радох таварыства, росту сьвядомасьці і актыўнасьці мас ставіць пытаньне аб пераглядзе «некаторых галін работ таварыства ў бок павялічэньня кантрольных лічбаў».

Рост калгаснага руху патрабуе ад Асоавіяхіму актыўнага разгортваньня работы па-новаму ў вёсцы і ў першую чаргу ў яе сацыялістычным сэктары. Таму зьезд ва ўсю шырыню паставіў пытаньне перад усёй беларускай арганізацыяй аб «найхутчэйшым стварэньні моцных ячэек у кожным калгасе і саўгасе».

Падыходзячая пасеўная кампанія павінна быць згодна дырэктывам нашай партыі, ператорана «ў другую бальшавіцкую вясну», і зьезд у сваёй рэзалюцыі падкрэсьлівае, што неабходна «кінуць усе сілы таварыства на дапамогу партыі і ўладзе ў пасьпяховым правядзеньні другой веснавой бальшавіцкай сяўбы..., паставіўшы перад кожнай ячэйкай Асоавіяхіму канкрэтны плян садзейнасьці і дапамогі. Склясьці асобныя брыгады і калёны па правядзеньні пратручваньня і ачысткі насеньня і насавай работы сярод аднаасобнікаў па ўцяпленьні іх у калгасы».

Зьезд падрабязна спыніўся на пытаньнях дапамогі, пашырэньню хімічнай прамысловасьці ў БССР, лічачы неабходным мабілізаваць вакол гэтага пытаньня увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці. Асоавіяхім павінен шырэй разгарнуць прапаганду і ўжываньне хімічных угнаеньняў і хімічных сродкаў барацьбы са шкодзікамі сельскай гаспадаркі.

Адначасова з гэтай прапагандай, зьезд паставіў задачу аб неабходнасьці ў гэту веснавую пасеўную кампанію зарабіць і зэкасіць 3.000 «гектараў абароны».

З мільённы камсамол у пытаньнях набліжэньня сваёй арганізацыі да справы абароны краіны зрабіў недапушчальна мала. Гэта і адзначаў тав. Варашылаў у сваёй прамове на IX зьезьдзе камсамолу, дзе ён гаварыў аб слабым удзеле камсамолу ў пытаньнях абароны дзяржавы. IX зьезд камсамолу вызначыў вялізарны зрух. Камсамол дабіўся пералому і ён прадзіўіць Асоавіяхіму больш патрабаваньняў, чым раней. Тэму ўзрастаючую актыўнасьць камсамолу трэба ўлічыць, каб Асоавіяхім не адстаў, і ў пастановах 2-га ўсебеларускага зьезду Асоавіяхіму падкрэслена неабходнасьць усім арганізацыям цясьней сьвязацца з камсамолам, практычна прыступіць да выкананьня дырэктыў партыі і пастанову IX зьезду ЛКСМ аб 100 процантным зьезде камсамольцаў Асоавіяхімам, барацьбы з недасьведчанай ваеннай работы сярод камсамольцаў, піянэраў і школьнікаў.

Штыльна падышоў зьезд і да пытаньня авіяцыйнай работы, увязаўшы гэта з шофтвам ЛКСМ над наветранным флётам РСЧА. Зьезд вызначыў арганізацыю асобных гурткоў, пляцовых станцый, адначасова ўзмацняючы работу па растлумачэньні важнасьці задач савецкага будаўніцтва.

Зьезд завастрыў перад усімі арганізацыямі Асоавіяхіму пытаньне аб неабходнасьці падвоіць увагу да задач штодзённага ўзмацненьня абароны краіны і магутнасьці Чырвонай арміі побач з напружаньнем сіл у справе сацыялістычнай будоўлі.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскай партыі беларускі Асоавіяхім у найкарацейшыя тэрміны павінен справіцца з пастаўленымі перад ім адказнымі задачамі.

І калі краіне Саветаў, ня гледзячы на яе палітыку міру, прыдзецца спаткацца з ворагамі, то беларускі Асоавіяхім скажа, што «мы вайны ня хочам, але будзем біцца з усёй сілай і запалам за перамогу сацыялізму».

Усесаюзная нарада па пытаньнях рабселькораўскага руху

Даклад т. Савельлева

У выкананьні грандыёзных плянаў сацыялістычнага будаўніцтва — пачынае свой даклад тав. Савельлеў—вялізарная роля належыць бальшавіцкаму друку. Друк стаў ня толькі калектыўным агітатарам і прапагандыстам, але і калектыўным арганізатарам найшырэйшых мас працоўных. Выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі прымушае друк і рабселькораўскі рух круга павярнуцца да пытаньняў вытворчасьці, якія зьяўляюцца ў цяперашні час часта рашаючымі.

Адна з буйнейшых перашкод на шляху сацыялістычнага будаўніцтва — гэта вялікае ня ўменьне ўсвоіць новую тэхніку. На гэтым чулым вучастку неабходна сканцэнтраваць увагу друку і рабселькораў. Неабходна павярнуцца тварам да тэхнікі, узяцца па-бальшавіцку за вытворча-тэхнічную прапаганду. Ядобра стаіць справа з сабекоштам і якасьцю прадукцыі. На гэтым вучастку трэба накіраваць тураганны агонь друку і рабселькораў. Трэба разьвіць шаленую актыўнасьць у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне якасных паказальнікаў.

Коратка спыніўшыся на задачах пяцігодкі і рабселькораў у галіне сельскай гаспадаркі, тав. Савельлеў пераходзіць да разгляду апартуністычных установак тав. Бухарына ў рабселькораўскім руху, даных ім на 4-й рабселькораўскай нарадзе. Посьпехі рабселькораўскага руху дасягнуты наперакор спробам тав. Бухарына на 4-й нарадзе дэзарыентаваць рабселькораў сваімі праваапартуністычнымі ўсталёўкамі, змазаць задачы барацьбы на два фронты. Аднак, наперакор гэтым спробам, рабселькоры над кіраўніцтвам партыі дапамагаюць змагацца з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, і «левымі» апартуністамі і прымірэнцамі.

Вялізныя і колькасныя посьпехі рабселькораўскага руху. У ст.узені 1925 г. рабселькораў налічвалася 140 тысяч. У 1928 годзе да 4-й уссаюзнай нарады рабселькораў было 500 тысяч. У цяперашні час колькасьць рабселькораў пераваліла за 2 мільёны. Рост рабселькораў непасрэдна зьвязан з вялізарным ростам пісьменнага друку.

У 1927 годзе пасьменных газэт і іматыражак было каля 60 тыс., а ў цяперашні час іх — каля 250 тыс. Друкаваных пісьменных газэт тады было 200, а цяпер каля 1.500. І вось у такі час, пры такім бурным рабселькораўскім руху знаходзяцца людзі, накшталт тав. Ляндау, якія мармычуць аб «крызісе» рабселькораўскага руху. Такія гутарачкі зьяўляюцца паклёпам на рабселькораў і самай масавай апартуністычнай недасьведчанай рабселькораўскага руху.

Пераходзячы да задач пісьменнага друку, тав. Савельлеў гаворыць, што ў цяперашні час ёсьць 500 раённых газэт. Але іх павінна быць звыш 2 тысяч—па колькасьці існуючых раёнаў. Такім чынам, стаіць задача—укамплектаваць новыя раённыя газэты аднаведнымі кадрамі, даць ім паліграфічнае абсталяваньне і г. д. Гаворачы аб вялізарным росьце фабрычна - заводзкіх газэт і аб іх ролі ў выкананьні прамфінпляну, тав. Савельлеў падкрэсьлівае значэньне газэт цэхавых. Сёла ўмацнуў гэтых пісьменных газэт надзвычайнае. Ня меншае значэньне маюць і насьценгазэты ў саўгасах і калгасах.

У апошняй частцы свайго дакладу тав. Савельлеў указвае на неабходнасьць максымальнай канцэнтрацыі ўвагі рабселькораўскай масы на пытаньнях правядзеньня генэральнай лініі партыі, на пытаньнях будаўніцтва сацыялізму і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Судаклад тав. Ушарэнка

На ранішнім пасяджэньні ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады 13-га лютага судаклад аб ударніцтве ў друку зрабіў тав. Ушарэнка.

Энтузіязм, які выяўляе зараз рабочая класа на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, новыя сацыялістычныя формы працы, — усё гэта знайшло свой адбітак сярод ударнікаў і друку. Ударныя брыгады, пясьменныя, — вышэйшая форма рабкораўскай работы на даным этапе. Пераход рабкора-адзіночкі да калектыўнай работы — брыгадай дазваляе значна шырэй прыцягваць масы да ўдзелу ў нашым друку. У выніку няўхільнага росту ўдарніцтва ў друку мы назіраем зараз радыкальную перабудову раду органаў нашага масавага друку ў аднаведнасьці з новымі задачамі. Асобныя газэты, аднак, успрымаюць ударніцтва фармальна, а на справе паваг аказваюць яму супраціўленьне. Гэта ўдна праваапартуністычная недасьведчанка ўдарніцтва ў друку. З другога боку былі выпадкі перагібу і ў другі бок, а іменна, імкненьне поўнасьцю ліквідаваць індывідуальнае рабкораўства і замяніць яго выключна брыгадным. У рабоце самых ударных брыгад ёсьць недахопы: так, напрыклад, брыгадні часта слаба асьвятляюць дадатні вопыт работы прадпрыемстваў. Мы яшчэ мала дапамагаем вёсны ў справе разгортваньня там ударніцтва, слаба видзем выхаваўную работу сярод самых ударнікаў. Гэтыя недахопы мы павінны перамагчы. Перабудоўваючы работу на ўдарныя мэтады, мы зробім выхаваць ленінскіх барацьбітоў за ленінскую лінію партыі, за сацыялізм.

У спрэчках па дакладах т. т. Савельлева і Ушарэнка выступіла 26 дэлегатаў.

На вечэрнім пасяджэньні з вялікімі прамовамі выступілі т. т. Ярасла́ўскі, Пестышаў і Грынько, якія былі спатканы бурнымі воплескамі.

Вялікая перамога пянкашырскіх ткачоў

ЛЯЦДАН, 13. Прадпрыемцы ліквідаванай бавэйнна-пэндровай прамысловасьці парашылі спыніць лёкаут, адмовіцца ад сваіх патрабаваньняў і адмовіцца ад работы на фабрыках 16 лютага па ранейшай сыстэме (4-х варштатаў на адного ткача). Такі вынік грандыёзнай барацьбы паміж ткачамі і прадпрыемцамі Ліверпулі зьяўляецца найбольш значнай перамогай ангельскіх рабочых за апошнія гады.

Інфармацыйнае паведамленьне

12-14 ЛЮТАГА АДБЫЛСЯ 2-гі ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ КП(б)Б. ПЛЕНУМ АБМЕРКАВАЎ ПЫТАНЬНІ: 1) АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І ДАЛЕЙШЫХ ЗАДАЧАХ У ГАЛІНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПА ПРЫГАРАДНЫМ РАЁНЕ І СУДАКЛАД АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ МЦРК; 2) АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ; 3) ВЫНІКІ ПАРТАСЬВЕТЫ ЗА ПЕРШАЕ ПАЎГОДЗЬДЗЕ; 4) ІНФАРМАЦЫЯ АБ ХОДЗЕ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ.

У СКЛАД ПЛЕНУМУ ЎВЕДЗЕНЫ Т. Т. **ВАЛОДЗЬКА, ГРОДЗІС І КАРАНЕЎСКІ.** ПЛЕНУМ ДАДАТКОВА ВЫБРАЎ У СКЛАД БЮРО РК ЧЛЕНАМІ Т. Т. **ВАЛОДЗЬКА, ГРОДЗІСА, ЦІМАШЭНКУ, КУМКЕСА** І КАДЫДАТАМІ Т.Т. **КАРАНЕЎСКАГА І РОХКІНА.**

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 14 лютага 1931 г.

Азнаёміўшыся з матар'яламі, зьмешчанымі ў «Зьвязьдзе» ад 14 лютага г. г. пад назвай «Ганебнейшая справа ў Капыльшчыне», аб арганізацыі масавага судовага працэсу супроць 167 сялян беднякоў і серадняковаў, ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Даручыць пракурору Рэспублікі тэрмінова прыцягнуць да судовай адказнасьці арганізатараў і вінаватых у судовым працэсе.

2. Для расьсьледваньня ўсёй справы на месцы тэрмінова камандыраваць камісію ў складзе т. т. Нікольскага (старшыня, пракуратура), Блоўштэйна (ЦКК-РСІ), Карана (ЦК КП(б)Б), Грахнёва (рэд. газ. «Зьвязда»).

3. Камісіі ў 5-цідзённы тэрмін даладзіць ЦК аб выніках расьсьледваньня справы і прынятых мерах.

4. Лічыць неабходным правесьці тэрміновае абсьледваньне становішча Капыльскага раёну ў галіне партыйнай і савецкай работы.

З тэзісаў аб вытворчай прапагандзе

(Чарнавыя нататкі)

У. І. Ленін, том 25, стар. 478-480, 3-е выданьне. Гэтыя тэзісы ляглі ў основу тэзісаў Галоўпалітасьветы, надрукаваных у «Праўдзе» № 267 ад 27 лістапада 1920 году пад загалоўкам: «Вытворчая прапаганда». (Праект тэзісаў Галоўпалітасьветы).

1. У цяперашні момант, у сувязі з васнымі перамогамі РСФСР і ня міжнародным становішчам паўтуп, вытворчая праграма павінна быць зноў выкінута на першы плян, узмоцнена і арганізацыйна умацавана.

2. Кіруючыя газэты «Известия» і «Правда» ў першую чаргу павінны: а) вымяншаць месца, што аддаецца палітыцы, павялічыць аддзел вытворчай прапаганды; б) уплываць на ўсю работу партыі ў савецкіх установах у сэнсе большага аддаваньня сіл вытворчай прапагандзе; в) імкнуцца сыстэматычна паставіць справу вытворчай прапаганды ў агульна-дзяржаўным разьмеры, выпрацоўваць шырокія мерапрыемствы яе разьвіцьця, палепшэньня і асабліва праверкі яе рэальных, што выяўляюцца на справе, посьпехаў.

3. Таксама сыстэматызаваць, пашырыць, разьвіць павінна быць работа па вылучэньні здольных адміністратараў, арганізатараў, вынаходдаў з асяродзьдзя рабочай і сялянскай масы.

4. Вытворчая прапаганда на ўсёй РСФСР павінна быць аб'яднана пад кіраўніцтвам аднаго органу, у мэтах эканоміі сіл і больш правільнага напрамку работы. Абсалютна неабходна пры гэтым найшырэйшая аўтаномія, мясцовая і прафесыянальная, сыстэматычная, правільна пастаўленая ўзнагарода (натуральныя прэміі) усякага значнага посьпеху; арганізацыя бесстароннянй і кампэтэнтнай праверкі посьпехаў.

5. Адзіным кіруючым органам вытворчай прапаганды павінна быць рэдакцыя папулярнай масавай газэты з тыражом у ½—1 млн. экзэмпляраў. Падзяленьне газэты такога тыпу на прамысловую і с.г.—шкоднае, бо задача сацыялізму—зблізіць і аб'яднаць прамысловасьць і сямляроблства. Практычна-ж кіруючая роля прамысловага пралетарыяту і ў горадзе і ў вёсцы, і ў прыватнасьці ўрбанізацыя сямляробства, ідэя электрыфікацыі ўсёй краіны патрабуюць іменна адзінай вытворчай газэты (адзінага кіраўніцтва вытворчай прапагандай) і для рабочых і для сялян.

6. Кіруючая калегія павінна складацца з 5 асоб: 1) ад УсеЦСНС; 2) ад ВСНГ; 3) ад Наркамзему; 4) ад Галоўпалітасьветы; 5) ад ЦК РСІ (або пасобных рэдакцый). Калегія газэты павінна быць пры УсеЦСНС (можа быць плюс яшчэ адзін ад Галоўпрафасьветы).

7. Вытворчая газэта павінна быць папулярнай, у сэнсе даступнасьці, але ня ўсім не ўпадаць у папулярнічаньне. Не апускацца да неразьвітага чытача, а няўхільна—з вельмі асьцярожнай наступоўнасьцю ўзьнімаць яго разьвіцьцё. Адлавать нямнога месца, прыкладна ня больш чвэрткі, палітыцы. Галоўнае месца—адзінаму гаспадарчаму пляну, працоўнаму фронту, вытворчай прапагандзе, навучаньню рабочых і сялян кіраваць, праверцы сапраўднага ажыцьцяўленьня законаў і мерапрыемстваў савецкіх установаў і гаспадарак, шырокаму і правільнаму абмену думак з чытачом-масавіком.

8. Матар'ял, які друкуецца ў газэце, што паступае ў газэту, а таксама іншы матар'ял, павінен сыстэматычна перавыдаванца брашурамі і лістоўкамі пэрыядычна для абавязковага вабесьпячэньня бібліятэк, потым усіх фабрык і прадпрыемстваў данай вытворчасьці. (Брашуркі і лістоўкі павінны сыстэматызаваць матар'ял па вытворчасьці). Побач з падручнікамі і аглядамі замежнай тэхнікі гэты матар'ял павінен служыць для распаўсюджаньня прафесыянальна-тэхнічнай і політэхнічнай асьветы. У прыватнасьці, больш правільнае разьмеркаваньне газэты, а таксама вытворчых брашур і лістовак па ўсіх бібліятэках РСФСР павінна складзіць прадмет асаблівай увагі.

9. Неабходна плянава арганізаванае прыцягненьне інжынэраў, агранома ў, настаўнікаў, потым савецкіх служачых, якія адпавядаюць поўнай кваліфікацыі, да ўдзелу ў справе вытворчай прапаганды. (У сувязі з ліквідацыяй няпісьменнасьці). Арганізацыя лекцый, гутарак, справаздач і інш. Працоўная павіннасьць усіх, што могуць знаёміць насельніцтва з электрыфікацыяй, тэйлёрызацыяй і г. д.

10. Больш шырокае сыстэматычнае скарыстаньне асоб для вытворчай прапаганды. Супольная работа з кіно-аддзелам. Савецкая пластыка. Выстаўка дыяграм і картаграм у клюбах, хатах-чытальнях, на вуліцах і інш. Расклейка афіш і плякатаў ля фабрык, майстэрань, тэхнічных школ і г. д.

11. Арганізацыя супольна з Наркампрацы і інш. установамі вытворчай інспэкцыі. Каардынаваньне яе работы з работай вытворчай прапаганды, таксама і работы інструктароў, інструктароў цытікоў, нараходаў і інш.

12. Вылучэньне ўзорных прадпрыемстваў, шырокая рэклама іх. Арганізацыя рабочых, якія перанялі замежны вопыт прамысловай работы—у асобных майстэрнях, або раёнах, ці ячэйках і г. д. Скарыстаньне іх для навучаньня аксталых, для папярэньня прафесыянальна-тэхнічнай і політэхнічнай асьветы і г. д.

У. ЛЕНІН.

18 лістапада 1920 году.

Камісіі выкананьня пры СНК саюзных і аўтаномных рэспублік

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР прызнаў неабходным стварыць пастаянныя камісіі выкананьня пры СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, а таксама краёвых выканкомах. Асноўная задача камісіі выкананьня — праверка фактычнага выкананьня дырэктыў ураду і мясцовых органаў, а таксама ўмацаваньне дысцыпліны ў дзяржаўных і гаспадарчых арганізацыях зьверху данізу.

У ПАХОД ЗА ЯКАСЬЦЬ

Змаганьне за высокія якасныя паказальнікі

РАЗГАРНУЦЬ ПА ЎСІМ ФРОНЦЕ

КОЖНАМУ РАБОЧАМУ—КАНКРЭТНЫ ПЛЯН ДЗЕЯНЬНЯ

Самацёк

Гомельская АБУТКАВАЯ ФАБРЫКА «ПРАЦА» мае правыў па якасьці і патанкельні сабекошту прадукцыі. Прычынай гэтага зьяўляецца адсутнасьць належнай работы з боку фабрычнай адміністрацыі, а таксама партыйных і прафэсыянальных органаў.

Рвацкія настрої і неправацельскія ад носіны да якасьці работы, якія назіраюцца сярод асобных рабочых, не сустракаюць належнага адпору.

Адсутнічае ўзорка паміж зьменамі. Бываюць выпадкі, што некаторыя зьмены па 3-4 гадзіны сядзяць без работы. Паміж зьменамі існуюць нездаровыя адносіны, імкненьні атрымаць больш пёгкую і сухую работу.

Належнай барацьбы з бракам не разгорнута. Брак і напарны абутак валяюцца па ўсёй фабрыцы. Былі факты, калі напарны абутак пастулае ў ЦРК, на чым фабрыка нясе вялікія страты. Адміністрацыя заготовачнага цэху значна адносіцца да сырцу. Некалькі соцень пар заготовак было выкрыта ў гэтым цэху пад падлогай па тэй прычыне, што «месца ня было», як «тлумачаць» майстры Ласеўскі і Гамбург.

Вытворчы сэктар не займаецца сваёй справай, бюракратычна адносіцца да рабочых прапаноў.

Трэба прысьвяціці галарэю тых, хто цягнецца ў хвосьце барацьбы за тэмпы трэцяга году пяцігодкі. Вось яны: Чаўскі, Бальфесн, Носьцерава, Красьніцкая, Чэрнін В., Віліячук, Герман, Карашкевіч, Палей Я. А., Разінская, Бурнеўская, Краўцоў, Касы, Загельскі, Майзьліна, Марозава, Фэйгін, Гінзбург, Песін, Рудкі, Бялінкоў, Узінскі, Сапавейчык М., Карчан, Гэрэліх, Хайкін, Шышкін, Босін, Зяткіна, Гіршына, Вайнэр.

Абавязчаная зараз дзесяцідзённая павінна ўнесьці круты пералом у работу фабрыкі, зьявіцца пачаткам разгорнутага паходу за высокую якасьць работы, за поўнае выкананьне прамфінпляну.

Брыгада:
НЯБЕЦКІ, БЕДРЫН, ДВОРКІНА.

Уключыліся ў паход

Зьлёт ударнікаў фабрыкі «Беларуска» (Менск), што ініцыявана адбыўся, паказ

Аўладаць вышынямі марксыцка-ленінскай тэорыі

Да 3-га пленуму ЦКК КП(б)Б

ЦКК КП(б)Б у барацьбе за генэральную лінію партыі

Сёньня закрываецца пленум ЦКК КП(б)Б. Па парадку дня пленуму стаяць чатыры важнейшыя пытаньні: — даклад аб рабоце прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і пастановах ЦКК УсеКП(б) на дакладу ЦКК КП(б)Б, наведамленьне аб прынятых пастановах прэзыдыуму і калегіі ЦКК КП(б)Б па справе Ігнатоўскага, Жылуновіча і іншых, вынікі праверкі і чысткі КП(б)Б, весняная пасоўная кампанія і калектывізацыя. Такім чынам, перад пленумам стаяць такія складаныя ды адказнейшыя задачы, якія патрабуюць да сябе ўвагі ўсёй КП(б)Б, каб на аснове пастановаў пленуму — мабілізаваць партыйныя арганізацыі, рабочых, калгасныя, батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы на змаганьне за далейшыя посьпехі ў ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі, за поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, закрэпіўшы гэтым самым набытку фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, на рашучае змаганьне за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі.

На взяце ленінскага адзінства

Пленум падагуліць вынікі 7-місячнай работы ЦКК КП(б)Б, якая праходзіла на аснове пастановаў XIII і XVI зьездаў партыі і пастановаў ЦКК УсеКП(б). Мэтадам бальшавіцкай самакрытыкі пленум праверыць як-жа ЦКК КП(б)Б і яе прэзыдыум змагаліся за генэральную лінію партыі, ачуўвалі ленінскае адзінства ў барацьбе з правым, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з права-сялянскім блёкам Сырцова-Ламінадзе, з нацыянал-апартуністамі, як агентурай контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму ў радах КП(б)Б, з двурушніцтвам і крыварэтнцтвам да ўхілаў ад ленінскай лініі нашай партыі і яе ЦК УсеКП(б). На гэтых асноўных пытаньнях прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 12-I—1931 г. на дакладу ЦКК КП(б)Б даў тады лозунг «ЦКК РСІ Беларусі рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, значна ўзмацніць за апошні час барацьбу з нездаровымі зьявішчамі ў партарганізацыі, скажэньнямі лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, а таксама работу на разгортваньні самакрытыкі, на абароне рабсялькораў, прэсінг рад істотных абсьледваньняў, накіраваных на ўзмацненьне тэмпаў індустрыялізацыі, сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі і сацыяльна-культурнага будаўніцтва».

Работа прэзыдыуму ЦКК за перыяд пасьля XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), як і работа ўсёй нашай партыі, праходзіла ва ўмовах абвастрэньня клясавага змаганьня. Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце і палітыка ліквідацыі кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі, якая праводзіцца партыяй, і ў выніку гэтага — пішаючая посьпехі сацыялістычная будаўніцтва, дасягнутая рабочай клясай, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі — выклікалі шалёнае супраціўленьне ўсіх варожых сіл дыктатуры пралетарыяту — куліцтва, падпрыхтоўку нападу на СССР з боку сусьветных капіталістаў, якія прабуюць сарваць будаўніцтва сацыялізму і зьнішчыць дыктатуру пралетарыяту.

Ва ўмовах абвастрэньня клясавага змаганьня, пры наўгнасьці трудасьцей сацыялістычнага росту, ажыцьцяўляючы гэтым самым набытку фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, на ўзмоцненьне дзейнасьці апартуністычных элементаў ўнутры нашай партыі, — правых і «левых» апартуністы, якія імкнуліся і імкнуцца аднаўляць сацыяльнай на іншых трудасьцях сьцінуць партыю з ленінскіх пазыцый.

ЦКК КП(б)Б на падставе пастановаў XVI зьезду партыі аб несумяшчальнасьці пазыцый правых апартуністаў са знаходжаньнем у радах партыі, рашуча выкрывала канкрэтных носьбітаў правага апартунізму, як у тэорыі, так і на практыцы, нанесьлі па іх рашучы ўдар.

Абсьледаньне з боку ЦКК соцыяльнай, варожай партарганізацыі выкрыла надзвычайку раду правапартуністычных скажэньняў у практычнай дзейнасьці пасобных ячэек, сьекцыйнага апарату і нават пасобных кіруючых работнікаў раёнаў. Была выкрыта апартуністычная практыка ў пытаньнях недапусканьня работы з бедняцтвам, калектывізацыі і наступленьня на кулака.

Выкрыты рад правапарчуністычных скажэньняў у радзе раёнаў у пытаньнях наступленьня на кулака, быў пакінем рашучы ўдар па настроях аб тым, што «ў нас няма кулакоў» (Прэнойск, Бешанковічы, Жлобін і інш.), якія ў сваё «не сваймі» кулакоў.

У галіне мабілізацыі сродкаў, загатовак рэчых прыбы — абсьледаньні ЦКК-РСІ своечасова выкрывалі і сыгналізавалі аб правапартуністычных скажэньнях на практыцы. Прэзыдыум ЦКК жорстка, з усёй бальшавіцкай рашучасьцю рэагаваў на ўсе гэтыя факты, бачы на канкрэтных носьбітах апартунізму, узьнімаў гэтыя факты на ідэйнаўзроўню палітычную вышыню, сваячасова сыгналізаваў партарганізацыям і мабілізаваў КП(б)Б на далейшае рашучае змаганьне з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, і прымірэньцтвам да яго.

ЦКК РСІ сваёй работай забясьпечыла ўзмацненьне барацьбы з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і «левымі» загібамі. На вялікіх абсьледаньнях фактах «левых» загібаў у Слуцкім раёне пры складаньні сьпіскаў кулакоў, у якія трапіла значная частка серадняцкіх мас вёскі, які ёсьць у наяўнасьці, дае нам магчымасьць значна ўзмацніць тэмпы калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Пленум ЦКК павінен намеціць такія мерапрыемствы, якія б забясьпечылі поўнае выкананьне тэмпаў 1931 году — 45 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР, — якія ажыцьцяўляюцца, бязумоўна, рэальнымі тэмпамі, дабіваючыся нязгібнага ажыцьцяўленьня алёзны ЦК УсеКП(б) і СНК аб кантрактацыі.

Рабочае забясьпячэньне — у цэнтр увагі

Пытаньні рабочага забясьпячэньня і загатовак займалі вельмі важнае месца ў рабоце ЦКК-РСІ, якая імкнулася сапраўды ператварыць намаганьні партыі на ажыцьцяўленьне намечанага пазыцыяна разьвітай зарплаты, палепшэньня работы савецкага апарату. Партыя дасягнула вялікіх посьпехаў на гэтым фронце клясавага змаганьня. Чыстка савецкага апарату і вылучэньне лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы ў савецкі апарат нанесьлі руйнуючы ўдар па бюракратызьме. Брэшуць на наш апарат апартуністы з права-сялянскага блёку аб тым, што, быццам, апараты сталі працаваць горш». Гэта паклёп. Мы маем значныя посьпехі ў даведзеньні работы савецкага апарату ў адпаведнасьць з задачамі рэканструкцыйнага перыяду.

Разам з гэтым неабходна падкрэсьліць, што дырэктывы XIII зьезду КП(б)Б, каб «узмацніць работу савецкіх ячэек у напрамку узмацненьня барацьбы з бюракратызмам, за рацыяналізацыю і спрашчэньне апарату»—праводзяцца яшчэ слаба. Далёка невыстарчальна работа органаў КК-РСІ у справе рацыяналізацыі апарату. Зусім правільна падкрэсьлена ў пастановах ЦКК УсеКП(б) аб недавальняючым становішчы масавага рабочага кантролю—шэфства над савецкім апаратам. У гэтым пытаньні патрэбен сур'ёзнейшы пералом. Таксама патрэбен пералом у тым, каб узьнімць увагу рабочых мас да справы чысткі савецкага апарату і праверкі рэалізацыі пастановаў на чыстцы. Пастанова ЦКК УсеКП(б) аб недавальняючай пастановцы кантролю і праверкі выкананьня з прыцягненьнем рабочай грамадзкасьці—патрабуе максімум'у увагі на арганізацыю кіраўніцтва і шырокага масавага кантролю зьнізу, які ажыцьцяўляцца ў разнастайных формах шырокімі рабочымі, калгаснымі і бядняцка-серадняцкімі масамі. Ня гледзячы на некаторае палепшэньне ў рабоце бюро скаргаў за апошні час на прыцягненьні мас рабочага актыву да барацьбы з бюракратызмам, усё-ж у гэтай галіне патрабуецца рашучае ўзмацненьне ўвагі пытаньням больш шырокага прыцягненьня мас у работу бюро скаргаў, давялічэньні іх ролі ў сэнсе сыгналізацыі і пастановкі пытаньняў на аснове абаўленьня недахопаў на скаргах, палепшэньня работы пасобных зьвеньняў апарату.

Работу органаў КК РСІ — на вышэйшую ступень

Пастаўленыя XVI зьездам УсеКП(б) і XIII зьездам КП(б)Б гігацкія задачы сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце патрабавалі адпаведнай перабудовы і ўзьвышэньня работы органаў КК-РСІ на вышэйшую ступень. Ліквідацыя акруг і стварэньне новых аўтарытэтных органаў ленінскага Рабкрыну ў раёнах займалі цэнтральнае месца ў рабоце ЦКК за апошні час. Арганізацыя КК-РСІ ў раёнах выклікала цэлы рад труднасьцей з падборам работнікаў (трэба было падабраць да 350 чал., акрамя апарату ЦКК-НК РСІ супроць паляўнасьці 68 работнікаў былых АКК). У сувязі з гэтым праведзена мабілізацыя работнікаў для райКК у радзе раёнаў і ў значнай ступені скарыстаны былыя работнікі і члены АКК і ЦКК. Адных, на сёньняшні дзень усё-ж месца даволі значны недахват работнікаў. ЦКК за апошні час зьвярнула галоўную ўвагу на жывое кіраўніцтва, інструктаваньне і аказаньне практычнай дапамогі ў рабоце КК-РСІ — праведзены масавыя выезды ў раёны з аходам больш паловы раёнаў БССР. Праведзены 7-міднёвыя курсы-нарады старшынь КК-РСІ, якія аказалі значную дапамогу ў рабоце. 36 работнікаў КК камандыраваны на курсы партработнікаў ЦК. Намечана скліканьне курсаў загадчыкаў бюро скаргаў. Галоўнейшым недахопам у гэтай частцы траба лічыць тое, што дырэктыва ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб падборы кадраў КК-РСІ выпадана слаба, што ўказана зусім правільна ў пастановах ЦКК УсеКП(б). За апошні час месца некаторы пералом па ажыцьцяўленьні гэтых пастановаў.

За дзейсьнасьць бальшавіцкай самакрытыкі

ЦКК-НК РСІ, на падставе пастановаў XIII зьезду КП(б)Б аб разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі правяла вялікую работу на барацьбе за дзейсьнасьць самакрытыкі. Праведзены ўсебеларускі рабсялькораўскі рэйд на рэагаваньні на заметкі, сумесна з газ. «Зьвязда» у якім прымала ўдзел 255 брыгад, 800 рабсялькораў, выявіў, што рад партыйных, прафэсыянальных, гаспадарчых і іншых арганізацый пытаньне барацьбы за дзейсьнасьць рабсельскораўскіх заметак ня ўзьнялі на прынцыповую вышыню і ў, радзе выпадкаў мела месца поўнае ігнараваньне рабсельскораўскіх заметак, зьмяшчаных у друку. У выніку праведзенага рэйду значна больш узмацніліся палітычная актыўнасьць рабочых і працоўных мас гораду і вёскі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, за разгортваньне дзейснай бальшавіцкай самакрытыкі. За час ад XIII зьезду КП(б)Б праз ЦКК крайняга рад рабсельскораўскіх спраў (Аксенчыка, Місьнікоай, Гародкага, Чэпурнка і рад рабкораўскіх спраў па Віцебску). Усе гэтыя справы прасьсьцільнія рабсельскораў зьяўляюцца фактамі недавальняючага разгортваньня самакрытыкі ў радзе партыйных арганізацый і паляўнасьці ў радзе месц заціску самакрытыкі. Траба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што самакрытыка разгорнута яшчэ далёка невыстарчальна. ЦКК зараз прыступіла да масагай праверкі выкананьня дырэктыў партыі аб самакрытыцы, аб разгортваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, накіраваных на барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць апартунізму, бюракратызму і шкодніцтва.

Вынікі праверкі і чысткі радоў КП(б)Б

Пленум будзе абгаварваць асобным пытаньнем вынікі праверкі і чысткі радоў КП(б)Б, якая праходзіла ў поўнай адпаведнасьці з пастановамі XVI партканфэрэнцыі і XII зьезду КП(б)Б. Чыстка і праверка выявіла, што ў масе сваёй КП(б)Б, разам з кіруючымі кадрамі, зьяўляецца здаровай, бальшавіцкі выстрыманай і здольнай справіцца з гігацкімі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Чыстка паказала, што КП(б)Б мае сярод шырокіх масс беспартыйных рабочых, калгасных, батрацка-бядняцкіх і асноўных серадняцкіх мас аяляцца вялікі аўтарытэт і карыстаецца вялікім давер'ем і падтрыманьнем з іх боку. Лепшым доказам гэтага зьяўляецца вялікі прыток рабочых—з вялікіх вытворчых стажам, актыўных ударнікаў (замест ня чыстчаных праверкомамі 3.717 уступіла 10.391), батракоў і бяднякоў у партыю. У выніку гэтага павялічылася рабочая праслойка ў КП(б)Б. Задача пленуму заключаецца ў тым, каб праверыць наколькі рэалізаваны вынікі чысткі, мабілізуючы ўсю партарганізацыю на далейшую барацьбу з нездаровымі зьявішчамі і ачышчэньне партыі ад апартуністычных, чужых і шкодніцкіх элементаў, дабіваючыся ўзмацненьня партыйнага выхаваньня і ўздыму палітычнага ўзроўню членаў партыі, аўладаньня апошнімі марксыцка-ленінскай тэорыяй, узьнімаючы ролю КК у барацьбе па напрадзіканьні нездаровых зьявішч.

Наўхільна ажыцьцяўляць ленінскую нацпалітыку

Паступаючае сацыялізму на ўсім фронце і зьвязанае з гэтым абвастрэньне клясавага змаганьня — выклікаюць актывізацыю ў радах партыі нацыянальных ухілаў у бок вялікадзяржаўнага і мясцовага шавінізму» (з рэз. XV партзьезду). Галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца вялікадзяржаўны шавінізм, разам з гэтым ні ў якім разе не павінна быць аслаблена барацьба супроць беларускага, польскага, яўрэйскага і інш. шавінізмаў. Пленум будзе абгаварваць асобным пытаньнем пастанову партколегіі і прэзыдыуму ЦКК па справе Ігнатоўскага, Жылуновіча і інш. Зусім устаноўлена, што контр-рэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм вядзе барацьбу супроць дыктатуры пралетарыяту, за капіталістычную рэстаўрацыю, стараючы злучыць фронт з беларускім нацыянал-фашызмам на той бок мяжы, зьяўляючыся, такім чынам, складаной часткай польскага фашызму. Таму бязьлітасная барацьба супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму зьяўляецца неабходнай умовай правядзеньня ленінскай нацпалітыкі ў БССР. ЦКК правяла вялікую работу па барацьбе з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал - апартунізмам, як агентурай падпэмаў у радах КП(б)Б. У адпаведнасьці з пастановамі XIII партзьезду і настрыніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930 г.), ЦКК праводзіла ачыстку КП(б)Б ад нацыянал-апартуністычных элементаў (Ігнатоўскі, Жылуновіч і інш.). Гэта работа будзе рашуча працягвацца і далей. Адначасова з гэтым трэба ішчэ раз падкрэсьліць, што галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца вялікадзяржаўны шавінізм.

ЦКК павінна і далей, побач з барацьбой з мясцовымі шавінізмамі, галоўную сваю ўвагу накіраваць на барацьбу і выяўленьне канкрэтных праяў вялікадзяржаўнага шавінізму, узмацненьне інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас.

* * *

Пленум падводзячы вынікі ўсёй праведзенай работы ЦКК-НК РСІ з часу XIII зьезду, павінен з усёй рашучасьцю выкрыць недахопы ў рабоце з тым, каб на аснове зусім правільных пастановаў прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) на дакладу ЦКК КП(б)Б мабілізаваць органы КК-РСІ і ўсю КП(б)Б на далейшую рашучую барацьбу за правядзеньне генэральнай лініі партыі. Зусім правільна ЦКК УсеКП(б) указала на слабасьць масавай работы на лініі нафсота, на лініі праверкі выкананьня з шырэйшым удзелам рабочых мас. Зараз створаны ўсе ўмовы для таго, каб ажыцьцявіць указаньні тав. Леніна аб арганізатарскай ролі КК-РСІ. За апошні час на ўсю работу ЦКК ацэнчаны шырокія працоўныя масы. ЦКК і надалей яшчэ ў большай ступені павінна ўзьняць арганізатарскую ролю КК-РСІ. Пленум ЦКК сваімі пастановамі на вузлавых пытаньнях работы будзе садзейнічаць далейшай мабілізацыі КП(б)Б на барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з правым «ухілам, як галоўнай небясьпекай, з прымірэнцтвам да іх,—за выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

ПАРТВУЧОБУ УВЯЗАЦЬ З ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ВАЖНЕЙШЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ І ГАСПАДАРЧЫХ КАМПАНІЯЎ

У НЕКАТОРЫХ РАЁНАХ ПАРТВУЧОБА У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ САРВАНА.—У 52-х РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯХ ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ АХОПЛЕНЫ ВУЧОБАЙ ТОЛЬКІ НА 40 ПРОЦ

Супроць апартуністычнай недаацэнкі

Выкананьне пастановаў сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б патрабуе яшчэ большага ўзмацненьня і павышэньня кіруючай ролі партыі, яшчэ большага не ідэйнага згуртаваньня і маналітнасьці, яшчэ большай непрымірымасьці да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі, яшчэ больш бязьлітаснай барацьбы ў першую чаргу з правым ухілам—кулацкай агентурай у партыі, з «левым» апартунізмам і з ухіламі ад ленінскай лініі партыі ў нацыятыцы.

Забесьпячэньне выключнай увагі да справы марксыцка-ленінскай вучобы, якая зьяўляецца мацнейшай зброяй партыі ў барацьбе за генэральную лінію—важнейшая задача кожнай партарганізацыі, кожнай парт'ячэйкі.

Становішча партасьветы на БССР сьведчыць аб палучаньні буйнейшых палітычных і арганізацыйных праграмаў у разгортваньні і рабоце сеткі партыйнай асьветы, што зьяўляецца вынікам недаацэнкі партвучобы кіруючымі парт-арганізацыямі.

Весткі па 52 раёнах БССР паказваюць, што партвучобай па гэтых раёнах ахоплена толькі 40 проц. партарганізацый. Такім чынам, 50 проц. камуністаў не ахоплена сеткай партасьветы. Навядзьнае школ і гурткоў партасьветы таксама зусім незадавальняе.

На Менску масавая партасьветская ахоплена 40 проц., а навядзьнае у сярэдзім раўняецца 25 проц. У Гомелі на заводзе імя Ланцуцкага заняткі па парэсьвеце наведвае толькі 22 проц. запісаных, на 9 вучастку ціт—24 проц. і г. д. Зусім дрэнна партвучоба пастаўлена на Гомсельмашы і «Вязьзі».

Работа сеткі партасьветы па БССР пачалася з вялікім спазьненьнем. У 10 раёнах, якія былі абсьледаваны брыгадамі культпропу ЦК у канцы лістапада, заняткі пачаліся ці ў канцы кастрычніка, або ў лістападзе. На сэраядзіх арганізаваных заняткі ў асноўным распаліся ў кастрычніку.

Зусім дрэнна ахоплены сеткай партасьветы ўступаючыя ў партыю рабочыя, батракі і калгаснікі. Ні адзін з раёнаў, абсьледаваных культпропам ЦК, не праводзіў курсаў для ўступаючых у партыю.

Тварытычная вучоба партактыву і падрыхтоўка партыйных кадраў у сетцы партасьветы знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы.

Параўнальна здавальняюча працуюць вячэрнія камвузы, у прыватнасьці менскі і гомельскі, цэнтральны Дом Партасьветы і курсы партактыву пры КУБ'е. З 20 вызначаных да арганізацыі дакладных камвузаў да гэтага часу працуе здавальняюча ня больш 6. Астатнія-я ня могуць разгарнуць сваёй работы, галоўным чынам, з прычыны адсутнасьці педагагічных кадраў.

Завочна-курсавая сыстэма навучаньня партактыву да гэтага часу кульгае на абедзьве ногі, з прычыны кепскай пастаноўкі справы ў арганізацыях, якія падуць завочна-курсавое навучаньне (адсутнасьць кваліфікаваных педкадраў, інструктажу і г. д.).

Актуальнейшае значэньне ў справе пастаноўкі партасьветы мае пасьлядоўнае выраўнаньне праблемы прапагандыцкіх кадраў. Кадры штатных прапагандыстаў пры райкомах яшчэ ня ўсюды ўкамплектаваны. Зусім невыстарчальна скарыстоўваюцца рабочыя прапагандысты і партыйныя работнікі на прапагандыцкай рабоце.

Недаацэнка ролі прапагандыстаў асобымі арганізацыямі прыводзіць да таго, што ў некаторых раёнах у якасьці прапагандыстаў скарыстоўваюцца камсамольцы і нават беспартыйныя настаўнікі (Сьніслаў). Слабы склад прапагандыстаў, арэзумела, адбіваецца і на зьмесьце партасьветы (ідэалёгічныя скажэньні на заняткох).

Невыстарчальныя тэмпы разгортваньня партасьветы ў цэнтрарганізацыях суправаджаюцца аднабакованьнем форм вучобы, што ўжываюцца як у горадзе, так і ў вёсцы. Тапія гібкія актуальныя формы, як гурткі, бягучая палітыкі, марксыцка-ленінскія прадметныя, або тэматычныя гурткі, не былі распаўсюджаныя ў нас у БССР.

Ударны дзень вучобы, які з вялікім посьпехам быў праведзен сьледам за «Чырвонай Прэсьнай» у Менску, на быў падхапілен іншымі арганізацыямі КП(б)Б. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчны навучальны плян ня сталі яшчэ асноўнымі мэтадамі работы сеткі партасьветы.

Галоўнейшым недахопам у справе партасьветы зьяўляецца зусім незадавальняючая, а у многіх раёнах поўная адсутнасьць кіраўніцтва з боку райконаў марксыцка-ленінскай вучобай і адсутнасьць праверкі выкананьня пастановаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б на разгортваньні партасьветы.

Партарганізацыі павінны зараз-жа на бальшавіцку перабудаваць усю работу па разгортваньні і кіраўніцтве партасьветы на месцах. Усе 100 проц. членаў і кандыдатаў партыі, 30-60 проц. беспартыйнага рабочага і калгаснага актыву павінны быць ахоплены сеткай партасьветы і курсамі на падрыхтоўцы ў партыю.

Два месяцы, што засталіся да пачатку веснавой сяўбы, павінны быць на вёсцы цалкам скарыстаны для масавай вучобы і пачатковых школах і гурткох бягучай палітыкі.

Сетка партасьветы павінна мабілізавацца на выраўнаньне задач выкананьня прамфінпляну, веснавой пасоўнай кампаніі і калектывізацыі, на палепшэньне работы чыгуначнага транспарту.

ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б надаюць выключнае значэньне завочным формам вучобы партыйнага актыву. Арганізацыя ўсесаюзнага інстытуту масавага завочнага навучаньня пры ЦК УсеКП(б) і арганізацыя філіялу гэтага інстытуту ў Менску палепшыць арганізацыйнае і праграмна-мэтадычнае кіраўніцтва завочным навучаньнем, прыцягнуўшы для гэтай справы такую моцную зброю, як радыё-вяшчаньне.

Кантынгент у 6.000 асоб па БССР, які маркуецца ахапіць завочным навучаньнем павінен быць забясьпечаны партарганізацыямі.

Галоўная перашкода ў разгортваньні партасьветы — апартуністычная недаацэнка яе радам партарганізацый павінна быць выкрыта пры дапамозе бязьлітаснае бальшавіцкай самакрытыкі.

Уся сетка партыйнай асьветы павінна быць мабілізавана на далейшае бязьлітаснае змаганьне ў тэорыі і на практыцы з ухіламі ад генэральнай ленінскай лініі партыі, на барацьбу з настроямі «самацёку» і квасьцісцкімі «тэорыямі», на выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

— М. МОДЭЛЬ.

Буйнейшы прарыў

Заняткі ў сетцы партыйнай асьветы па Барысаўскім раёне пачаліся з вялікім спазьненьнем. На «Чырвонай Бярэзіне», камбінаце і іншых прадпрыемствах партыйныя школы былі арганізаваны і ўкамплектаваны толькі ў лістападзе. На заводзе «Домбаль» заняткі ў партшколе пачаліся толькі ў студзені.

Ужо гэтыя факты выраўна гаварыць аб тым, што партарганізацыі не аддаюць патрэбнай увагі пытаньням партыйнай асьветы, ахопу бо шырокіх партыйных мас і беспартыйных рабочых. На заводзе «Домбаль», як і на радзе іншых прадпрыемстваў, ня было праведзена ніякай падрыхтоўчай работы да пачатку вучобы. З ліку 160 камуністаў толькі 40-45 займаюцца ў тых ці іншых партыйных школах. На заводзе ёсьць вялізарны рабочы актыў, які асабліва вырас і ўзмацніўся за час штурму прарыву ў прамфінпляне, за час барацьбы супроць спазьнілых і ўдарніцтва. Партколектыў ня прыняў ніякіх захадаў, каб ахапіць гэты актыў сеткай партыйнай асьветы. З тысячнага рабочага калектыву ў партшколах навучаецца толькі 5 беспартыйных рабочых.

Гэта, бясспрэчна, сьведчыць аб апартуністычнай стаўцы на самацёк у пытаньні аўладаньня шырокімі партыйнымі і беспартыйнымі рабочымі масамі марксыцка-ленінскай тэорыяй. І райком і парткалектывы добра ведалі, што зрываецца партвучоба, ня выконваюцца важнейшыя дырэктывы партыі, але ня прымалі ніякіх захадаў, каб папярэдзіць зрыў партвучобы, каб моцна ўдарыць на існуючай недаацэнцы вывучэньня марксыцка-ленінскай тэорыі.

На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» партыйная асьветая ахоплена на больш як 20 проц. камуністаў. Пераважная большасьць членаў і кандыдатаў партыі савецкіх ячэек сеткай партыйнай асьветы не ахоплена і нідзе ня вучыцца. Усімі відамі вучобы, рабочай прафэсыянальнай і партыйнай — ахоплена ня больш як 40-45 проц. складу партарганізацыі. Выключна партыйнай асьветай ахоплена ўсяго 15-20 проц. членаў і кандыдатаў партыі і зусім незначная колькасьць беспартыйнага рабочага актыву.

Арганізаваныя вячэрнія партыйныя школы на буйнейшых фабрыках і заводах Барысава разваліліся з-за адсутнасьці адпаведных кваліфікаваных кадраў прапагандыстаў.

У вячэрнім камвузе займаецца 40-45 членаў і кандыдатаў партыі, з якіх толькі незначная частка рэгулярна наведвае заняткі. Бываюць такія выпадкі, што на заняткі камвузу прыходзяць 1-2 чалавекі. Некалькі выкладчыкаў на працягу вечара абслугоўваюць аўдыторыю з лікам 2 слухачоў.

Партыйныя школы зусім ня ўдзельнічаюць у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

Пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, важнейшыя ўказы СНК СССР і ЦК УсеКП(б), пытаньні нацпалітыкі пераважная большасьць школ не прапрацоўваюцца.

Такое становішча ў раёне стварылася толькі ў сувязі з тым, што пытаньнямі партыйнай асьветы займаюцца культпропы парткалектывы, спэцыяльныя працаўнікі па гэтай галіне работы вячэек і культпроп райкому без належнай садзейнасьці з боку РК і большасьці бюро парткалектываў і ячэек.

Першае паўгодзьдзе сьведчыць аб нязгарным прарыве ў Барысаўскай партарганізацыі на фронце партыйнай асьветы, аўладаньня шырокімі масамі марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Н. П.

Пастанова

Бюро менскага гарадзкога кам'тэту КП(б)Б

ЗАСЛУХАЎШЫ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ КУЛЬТПРОПУ АБ НЕАДНАРАЗОВЫХ ЗРЫВАХ ПАРТВУЧОБЫ ПА ПРЫЧЫНАХ СКЛІКАНЬНЯ МАСАВЫХ СХОДАЎ І НАРАД У ДНІ ПАРТВУЧОБЫ, СКЛІКАНУЮ САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВЫМ СЭКТАРАМ ЦСПСБ ШЫРОКУЮ НАРАДУ ПА ПЫТАНЬНІ РАБОТЫ ЗАКРЫТЫХ РАЗЬМЕРКАВАЛЬНІКАЎ НА 15-ГА ЛЮТАГА Ў ДЗЕНЬ ПАРТВУЧОБЫ — АДМЯНІЦЬ.

ЗЬВЯРНУЦЬ УВАГУ ФРАКЦЫІ ЦСПСБ НА НЕДАПУШЧАЛЬНАСЬЦЬ СКЛІКАНЬНЯ СХОДАЎ І НАРАД АКТЫВУ Ў ДНІ ПАРТВУЧОБЫ.

Папраўка

У пастанове ЦК КП(б)В аб становішчы ў Барысаўскай арганізацыі («Зьвязда», № 43, ад 14-II—1931 г.) па тэхнічным недагляде ўкралася памылка. Пункт 5 памянёнай пастановы трэба чытаць так:

«Адначасова ЦК пічыць палітычнай памылкай выняснэньне на абмеркаваньне партыйных калектываў» і г. д.

Выкарыстаць завочныя формы вучобы

Усім сакратаром РК КП(б)Б

Пастановай ЦК УсеКП(б) ад 16-га кастрычніка 1930 г. прапанавана было значна пашырыць уцягненьне камуністаў у завочныя формы асьветы. Вызначалася, што завочнае навучаньне павінна стаць асноўнай формай вучобы партактыву. У якасьці аднаго з асноўных мэтадаў завочнай вучобы рэйтася скарыстаць радыё. Прапанавалася арганізаваць пры ўсіх буйных партакалектывах кансультацыйныя пункты для дапамогі завочнікам, а таксама аб'яднаць апошніх у гурткі.

У разьвіцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-X 1930 г. адносна завочнай вучобы, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанавіў:

а) арганізаваць перадачу праграм завочнага камвузу па радыё, а таксама кансультацыю па вучобе для партактывы;

б) прапанаваць райкомам і ячэйкам КП(б)Б у раённых і фабрычна-заводскіх пунктах, дзе ёсьць радыё-трансляцыйныя вузлы, і ў палітустановах, дзе ёсьць гучна-гаворачыя радыё-прыёмнікі, арганізаваць радыё-аўдыторыі, абстаяваць спэцыяльныя пакоі для радыё-слуханьня.

Да гэтага часу з раёнаў не паступаюць весткі аб правядзеньні ў жыцьцё пастановы ЦК КП(б)Б аб арганізацыі радыё-аўдыторый, а таксама вельмі нарудныя тэмпамі праходзіць упамянутаваньне завочна-курсавога сэктару камвузу.

Неабходна мець на ўвазе, што на працягу бліжэйшага месяца згуртаваньне колькасьць завочнікаў, што вучацца па праграмах камвузу, павінна быць даведзена да 2 тыс. асоб. Апрача таго, арганізуецца камсамольскі унівэрсытэт на 1.000 асоб, цэнтральная завочная саўпартшкола пры камвузе таксама на 1 тыс. чал.; павялічваецца да 1 тыс. асоб кантынгент студэнтаў рабоча-калгаснага унівэрсытэту і пашыраецца завочна-курсавы сэктар Гомельскай саўпартшколы.

У сувязі з усім вышэй паданым прапануецца тэрмінова, не пазьней 15-га лютага г. г., даць весткі у Культпроп ЦК КП(б)Б з копіяй завочна-курсавому сэктару КУБ'у аб арганізацыі радыё-аўдыторый, аб ходзе камплектаваньня веснавога набору ў завочныя навучальныя установы.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Заг. сэктарам прапаганды КАНАКОЦІН.

Хроніка партвучобы

2 сакавіка адкрываецца ўсебеларуская нарада па пытаньнях партыйнай асьветы. Нарада заслухае і абмяркуе наступныя пытаньні:

1. Уступнае слова сакратара ЦК КП(б)Б.

2. Вынікі партасьветы за першае паўгодзьдзе і далейшыя задачы.

3. Падрыхтоўка і перападрыхтоўка партыйнага актыву і сыстэма завочнага навучаньня.

4. Партасьвета і веснавая пасоўная кампанія.

На нарадзе будзе прымаць удзел 60 пазаўсіх і раённых работнікаў.

* * *

1 сакавіка пры ўсебеларускай саўпартшколе адкрываецца 3-месячныя курсы пізавога кіруючага партактыву. На першым скліканьні курсаў будзе навучацца 20 сакратароў цэхавых парт-ячэек, 15 партарганізатараў і 20 членаў бюро сельскіх ячэек.

* * *

Гэтымі днямі выйдзе з друку першы нумар часопісі-падручніка для пачатковых партшкол, камсамольскіх палітшкол і гурткоў бягучай палітыкі—«Ленінская вучоба».

* * *

5 лютага распачала работу камісія, якая выпучана сакратарыятам ЦК КП(б)Б у складзе т. т. Канонсіна, Танхілевіча і Ошарава па абсьледваньні камвузу імя Леніна. Адначасова з камісіяй ЦК праводзіць усебаковае абсьледваньне работы камвузу брыгада культпропу ЦК УсеКП(б) пад кіраўніцтвам тав. Акуліча.

Аб партасьвеце толькі разважаюць

Культпроп Мсьціслаўскага райкому партыі ўсю падрыхтоўку да навучальнага году, да ахопу масы камуністаў сеткай партыйнай асьветы вьёў толькі да агульных разважаньняў, не заблокічыўшы практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб партвучобе.

Райком не мабілізаваў увагі камуністаў і беспартыйнага актыву на неабходнасьці вывучэньня марксыцка-ленінскай тэорыі, на ахопе кожнага камуніста тым ці іншым відам партыйнай асьветы. У выніку гэтага большая частка партарганізацыі нідзе ня вучыцца. Не забясьпечана кіраўніцтва работай школ і гурткоў, якія былі арганізаваны ў горадзе, і вёсцы. Значная частка школ і гурткоў разваліліся з-за дрэннага наведваньня, з-за адсутнасьці кадру выкладчыкаў, памяшканьня і адпаведных падручнікаў.

Райком партыі ня выканаў дырэктывы ЦК аб завочным навучаньні і аб тэарытычнай вучобе партыйнага актыву. З ліку партыйнага актыву тольк

АДОЗВУ АБ КАНТРАКТАЦЫІ

зрабіць магутным вагаром калгаснага прыліву

Калгасы, саўгасы і вёскі, бярэце прыклад з калгасу „Энгельс“— уключайцеся ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту!

РАПАРТУЙЦЕ X УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ АБ ВЫКАНАНЬНІ АСНОЎНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯСНЫ

„Рэчыцкая праўда“ стала на чале барацьбы за калгасны прыліў

Сацдагавор Нахаўскага і Васілевіцкага сельсаветаў на лепшую падрыхтоўку да вясны

Да апошняга часу ў рабоце Нахаўскага сельсавету, Рэчыцкага раёну, быў рад сур'ёзных прарываў. Пяты восновой сяўбы няжаў у папцы секратара сельсавету, а вёскі гэтага плану на водані. Цьвёрдыя заданьні не даведзены да купацка-заможных гаспадарак. Зусім марудна ішло вычыстка насеньня. Замест 1.000 цэнтнэраў, вычышчана было толькі... 190 цэнтнэраў.

З 772 гаспадарак было калектывізавана 110. Мясцовыя арганізацыі не намецілі канкратных мерапрыемстваў па арганізацыі новага прыліву. Ня дзіўна, што пры такой «рабоце» мясцовых арганізацый прыліў быў вельмі нязначны. У той-жа час кулацтва і яго агенты падкупачнікі і сэктанты вялі шалёную агітацыю супроць калектывізацыі і нагоўн мерапрыемстваў партыі і савецкай улады на вёсцы.

Кіраўнік сэктанцкай групы Ковапонка Іван кадзіў па вёсках з евангельлем і агітаваў: «Не кадзеце ў калгасы, бо савецкая ўлада ўсё роўна падае да вясны», «Пяцігодка ня будзе выканана, здохну я, калі не пераканаю на свой лад». Другі кіраўнік сэкты Маргун Сьцяпан таварыў: «Хто крыку пацерпіць і ня ўступіць у калгас, той будзе жыць». Цінава тое, што Маргун зьяўляўся і зьяўляецца членам шкельнае рады, дзе сарваў пастанову аб політэхнізацыі школы. Маргун «растлумачваў» бацькам вучняў: «Політэхнізацыя—гэта прымацаванне вучняў да калгасаў для эксплёатацыі». Актыўныя прапаведнікам гэтых жа «ідэй» зьяўляецца видомы Лісавацкі.

Гэта «сьвятая» тройка праз сваіх сэктантаў на мясцох пераадала контр-рэвалюцыйнай агітацыяй па ўсім сельсавеце. Сэктанты асабліва актывізаваліся пры справаздачна-перавыбарчай кампаніі праўленьняў калгасу. У вёсцы Замосьце напярэдадні перавыбараў арудавалі відомыя сэктанты Глушацкі Сьцяпан і Пятрэнка Міхась. Калі дадаць тое, што бюро парт'ячэйкі не вяло ніякай растлумачальнай работы сярод бедноты, дык стане зрозумелым, які значны ўплыў гэта агітацыя мела сярод сялянства.

Для таго, каб ліквідаваць гэтыя прарывы, дапамагчы мясцовым арганізацыям дамяць калгасным і бяднацка-сераднацкія масы аднаасобнікаў на падрыхтоўку да вясны, прасунуць у гушчу мас думку аб перавазе калектыўнай гаспадаркі перад аднаасобнай, дабіцца да вясны скончэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі па Нахаўскім сельсавеце і ліквідацыі кулацтва як класы, рэдакцыя газеты «РЭЧЫЦКАЯ ПРАЎДА» НАКІРАВАЛА Ў СЕЛЬСАВЕТ ВЫЯЗНУЮ РЭДАКЦЫЮ. Брыгады з работнікаў вызнай рэдакцыі, мясцовага партыйна-камсамольскага актыву з удзелам калгаснага і бяднацка-сераднацкага актыву вёскі, разъехаліся па ўсіх вёсках і разгарнулі масавую работу сярод бяднацка-сераднацкіх мас сялянства.

Брыгады разгарнулі па вёсках значную работу па падрыхтоўцы да вясновай сяўбы. Ва ўсіх калгасах складзены выторчыя планы. Штодзенна ў вызную рэдакцыю паступалі зводкі: «Намі праведзены сходы вясковага актыву, калгаснікаў, жанчын і бедноты. Стаялі пытаньні аб вясновай сяўбе і калектывізацыі. Выпушчаны два нумары насьцэнгазэт, у якіх дзецца рашучы бой кулацка-сэктанцкай агітацыі. Сабрана звыш 600 руб. розных ахвяраванасьці. За апошнія дні паступілі 3 заяў аб уступленьні ў калгас. Працуе пярбовачная тройка, абезшчан ударны 10-дзеньнік па вярбоўцы ў калгас».

Такія-ж заводкі паступалі ад брыгад іншых вёсак. У вёсцы Лоскі брыгада выкрыла кулака Канаковіча і падкупачніка, міліцыянера Малашчанка, якія запалохвалі беднату. Выкрыта 10 заможных гаспадарак, да якіх даведзены цьвёрдыя заданьні па ўсіх відах загатовак. Дабіліся выкананьня плану мабілізацыі ўрэдкаў па вёсцы на 80 проц. Калгас «Герой працы» вырас на 5 гаспадарак. У калгасе план засыпкі насеньня фонду выкананы на 100 проц.

На разьезьдзе Нахаў у выніку масавай работы брыгады арганізаўся новы калгас з 22 гаспадарак, які назван імем «Рэчыцкай праўды». У вёсцы Нахаў выяўлена сэктанцкая кіруючая група з 3-х асоб—Лісавацкага Івана, Ковапонка Івана і Маргуна Сьцяпана, якая вяла шалёную агітацыю супроць калгасу. У зьвязку з выкрыцьцём сэктанцкай групы калгас вёскі Нахаў значна вырас. Выяўлены 3 кулацкія гаспадаркі, якія плацілі сельгаспадатку па 1 руб. 40 кап.

ІДЭЯ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫЎІЗАЦЫІ ПРАСЯКЛА Ў ШЫРОКІЯ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ. НА АГУЛЬНЫХ СХОДАХ ПРЫНЯТА ВЫСУНУТАЯ РЭДАКЦЫЯЙ ПРАПАНОВА АБ ЗАКЛЮЧЭНЬНІ САЦДАГАВАРОЎ ПАМІЖ АСОБНЫМІ КАЛГАСАМІ І СЕЛЬСАВЕТАМІ НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І СКАНЧЭНЬНЕ ДА ВЯСНЫ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫЎІЗАЦЫІ.

Асабліва характэрным зьяўляецца сацдагавор, заключаны паміж Нахаўскім сельсаветам і праўленьнямі калгасаў «Наша ніва», «Чырвоны арэхаў», «Чырвоны каўнэр», «Герой працы», «Добрая воля», «Рэчыцкая праўда» з аднаго боку, і Васілевіцкім сельсаветам і праўленьнямі калгасаў імя Сталіна і Молатава—з другога.

Паводле гэтага сацдагавору сельсаветы і калгасы прынялі на сябе рад канкрэтных абавязкаў па лепшым правяданьні падрыхтоўкі да вясновай сяўбы, арганізацыі новага прыліву ў калгасы і лепшай пастаноўцы работы ў калгасах і сельсаветах.

Усе члены Нахаўскага і Васілевіцкага сельсаветаў абавязаліся першымі ўступіць у калгасы і праводзіць актыўную работу па ўцягненьні бяднякоў і сераднякоў—адзіаасобнікаў у калгасы.

Павінна весьціся актыўная барацьба з кулацка-сэктанцкай агітацыяй і ўсялякімі спробамі кулакоў і падкупачнікаў, накіраванымі на зрыў суцэльнай калектывізацыі ў правяданьні мерапрыемстваў партыі і ўраду.

У ГАЛІНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ НАХАЎСКІ І ВАСІЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТЫ АБАВЯЗАЛІСЯ ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПЛЯН СЯЎБЫ, ДАЎШЫСЬВОЙ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ПАСЕВУ Ў БОК ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ТЭХНІЧНЫХ І КАРМАВЫХ КУЛЬТУР І ПОЎНАСЬЦЮ ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ ІХ.

На працягу пятага павінны быць ардэмантаваны ўвесь інвэнтар, вычышчана на 100 проц. насеньне і г. д.

Праўленьнем калгасаў абавязваецца правільна арганізаваць працу ў калгасах, шляхам стварэньня ўдарных брыгад па жывёлагадоўлі, палеводзтве гародніцтве і інш. І разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Работа ў калгасах павінна быць пераведзена як працадні і зьдзельнічыну.

Рэдакцыя «Рэчыцкай праўды» са свайго боку абавязваецца кажэртна дапамагць у выкананьні гэтага дагавору, сачыць і нарыдычна праз газету асьвятляць ход яго выкананьня.

Г. ГАРЭЛІК.

Правыя апартуністы зьмяншаюць пасеўныя пляны

Упаўнаважаны НКЗ патурае гэтым спробам

ГЛУСК. (Брыгада «Зьвязды»). Падрыхтоўка да вясновай сяўбы на Глускім раёне разгортваецца вельмі дрэнна і праходзіць пераважна самацёкам. Раёну надаецца жывёлагадоўчы-ільняны накрамак. Але кантрольныя лічбы Наркамзему па культурах, якія зьвязаны з напрамкам раёну наменшаны. Так, лічба засеву бульбы зьніжана на 1.114 гэкт. Між тым, разьвіцьцё гэтай культуры ў раёне мае асаблівае значэньне ў зьвязку з наяўнасьцю двух вінакурных заводаў і падрыхтоўкай да пуску аднаго крухмальнага заводу.

Паменшана таксама лічба на ільне на 93 гэкт., пераньлодах на 210 гэкт., адпадкодных травах на 236 гэкт. Адначасова павялічаны правыя абожжавыя культуры, якія зьяўляцца найменш працаёмкімі культурамі.

Упаўнаважаны Наркамзему тав. Грузакоў прапарў посеўны план раёну, але ніякіх заваг не зрабіў, экрана паметкі ў акце аб памяншэньні лічбы ільну на 95 гэкт. Ніякіх паказаньняў адносна недапушчальнасьці зьмяншэньня плошчы пад культуры, якія ў пашырэньнем карміавой базы, ня было зроблена.

Гэты-ж упаўнаважаны даганяў старшыні РВК тав. Заленка, што ў раёне ўсё добра. Памін тым, план складзен вельмі блытана з вялікай колькасьцю лічбаў, у якіх самі агрономы і работнікі земадзелу райкалгасаюзу ня могуць разабрацца. У такім выглядзе плян пушчан у сельскія саветы.

Посеўны плян ніяк даведзены не даведзен да кожнага населенага пункта. Аднак абожжа ў індывідуальным сэктары амаль не расказана. У Сімавіцкім сельсавеце плян выкананы усяго на 3 проц., у Дзяменскім сельсавеце — на 5 проц. і г. д.

Рэшта гаспадарча-палітычныя кампаніі на ўмяцняцца з падрыхтоўкай да вясновай сяўбы і арганізацыі подъема калгаснага прыліву. Адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі ніяк не папулярызавана і не прапрацавана па вячэнках, вёсках і калгасах.

Зусім незадавальняюча відзецца барацьба з кулаком. Па Сімавіцкім сельсавеце раней нічыліся 3 кулакі, толькі цяпер на групе бедноты пры сельсавеце выяўлены ніяк 3 кулакі. У адносінах да кулакоў, якія пазбавілі цьвёрдых заданьняў, ні былі прыняты меры ўзьдзейнасьці. Выяўлен рад выпадкаў недабкладаньня кулакоў.

У апошні час выявіла сесія Глускага аддела прыцягнула 3 кулацкіх гаспадарні да судовай адказнасьці за невыкананьне дзяржаўных заданьняў. Трэба сказаць, што кулак у Глускім раёне да гэтага часу не адчувае націску. Ён вядзе шалёную агітацыю за ірыў падрыхтоўкі да вясновай сяўбы і калектывізацыі. Разам з недапушчальнай барацьбы з кулаком, недабкладаньнем кулацкіх гаспадарак — у раёне нагнадзяюцца ацтысарадняцкія перагібы ў пытаньнях загатовак. Замест правядзеньня масавай падрыхтоўчай работы на самабаслугаваньнях, выбраныя на сходах камісіі раскладаюць лічбы загатовак па дворах і лічаць гэта самабаслугаваньнем. Гэтыя перагібы як правага, так і «левага» напрамку падрываюць работу на калектывізацыі вёскі, спазчаюць выкананьні плянаў загатовак і кантрактацыі кравых.

У «Зьвязьдзе» ўжо паведамлялася аб вынаходзе кіраўніцтва райсамадзеду і райкалгасаюзы за правую практыку. Райком партыі зусім правільна ўдарыў па правых апартуністах з земадзеду і райкалгасаюзы, якія спазнаў бязьдзейнасьцю і стаўкай на самацёк прымалі выкананьне важнейшых дырэктыў партыі і ўраду аб падрыхтоўцы да сяўбы.

Новаму кіраўніцтву райсамадзеду і райкалгасаюзы трэба хутчэй і больш упарта выкарчоўваць правазапартуністычную практыку мінулага кіраўніцтва.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ» і «ПРАЎДЫ».

КАЛГАС „ЭНГЕЛЬС“ абвяшчае сябе ўдарным

Сельска-гаспадарчая арцель «ЭНГЕЛЬС» уключаецца ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту, якая абвешчана газэтай «Социалистическое Земледелие».

Мы ўжо разгарнулі падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны. Насоўныя фонды азяль усіх правых культур над выкананы. Мы поўнасьцю выконваем дырэктывы партыі і ўраду аб пашырэньні посеўнай плошчы, асвойва пад тэхнічныя і кармавыя культуры і засяваем: 300 гэктараў бульбы, 152 канюшины, 137 сэрадэлі, 30 гэкт. кармавых кормапладоў, 36 гэктараў гародніны, 27 гэкт. кукурузы, 290 гэктараў аўса і рад іншых культур. Упершыню будзем сеяць канюшыну—5 гэктараў, тутэйш—2 гэктары.

Першая вычыстка насеньня ўжо зроблена. Ідзе другорная вычыстка. Яна ўжо выканана на 30 проц.

Насоўныя хлабе, за выключэньнем тых культур, якія мы сеем сёлета ўпершыню.

Насоўным гародніны мы зможам забясьпечыць ня толькі свае патрэбы, але і ўсіх калгасаў Уваравіцкага раёну. Гэта адно з вялікарных дасягненьняў нашай калгаснай гаспадаркі, бо гародным насяніцтвам мы займаемся ўсяго толькі адзін год.

Мы лічым, што тэмп паўторнай вычысткі ідзе ў нас на ўсіх вядзьлінчка. Чатыры збожжавычышчальныя машыны працуюць усяго ў адну зьмену. У сувязі з гэтым абавязваемся ўзмацніць тэмп збожжавычысткі, перавесьці працу збожжавычышчальных машын на дзьве зьмены і скончыць вычыстку да адкрыцьця X усебеларускага зьезду саветаў.

Даволі кепскім тэмпам у нас ідзе рамонт машын і інвэнтару. Працуюць кавальня, рыхтарня і калёсная майстэрні. Калёсная майстэрня абвяшчае сябе ўдарнай, абавязваючыся перавыканаць план выробу жарасовачнага інвэнтару.

АД РЭДАКЦЫІ:

Вітаючы пачынаньне калгасу «Энгельс», «Зьвязда» уключаецца ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту і заклікае ўвесь цэнтральны і раённы друк, уключыўшыся ў эстафэту, разгарнуць масавую кампанію за выкананьне асноўных мерапрыемстваў падрыхтоўкі да сяўбы да X усебеларускага зьезду саветаў і скончэньне ўсёй падрыхтоўкі да ўсесаюзнага зьезду саветаў.

Разгортваючы сацспаборніцтва спрод усіх майстэрань, мы абавязваемся цалкам скончыць рамонт да адкрыцьця ўсебеларускага зьезду саветаў.

250 коняй, якія мы маем, хопіць для правядзеньня веснавой сяўбы. Бранізаваныя фуражныя фонды створаны. Скарыстоўваньне коняй у нікоўы перыяд узята над суровы нагляд.

Палепшыўшы догляд коняй, разгортваючы сацспаборніцтва паміж конюхамі, абавязваемся захаваць жывую цягавую сілу да вясны ў поўным парадку, не дапускаючы, каб коні худзелі.

Вытворчы план прапрацаваны па плянавых групах і па калгасным актыве. Плян выдомы кожнаму калгаснику. На аснове вытворчага плану складзен рабочы плян па ўсіх галінах гаспадаркі.

Зараз калгаснікі вывучаюць працы сустрэчны плян, які перазьвітае заданьне раёнкалгасаюзу і павялічвае высунутыя ў двух раённых сустрэчных пляках абавязкі на тэхнічных і кармавых культурах.

Ідзе прыкацоўваньне брыгад да пасобных галін работы, выпадзьне сацыялізацыі кожнага калгасніка, прапрацоўка норм зьдзельшчыны.

Да 11 сакавіка мы абавязуемся поўнасьцю скончыць расстаноўку рабочай сілы і арганізаваць працу да вясны.

Сельска-гаспадарчая арцель «Энгельс» абвяшчае сябе ўдарным калгасам і, бяручы сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў падрыхтоўцы да вясны, пакажа на справе ўзоры калгаснай працы для вакольных адпаасобнікаў. Агітуючы паказам, разгортваючы масавую работу, «Энгельс» бярэ на сябе абавязак—рабіцца поўнага выкананьня плану кантрактацыі ў сельсавеце, калектывізаваць Лапіцкі сельсавет да вясны на 80 проц., а да восені—на ўсе 100 проц. Мы выручаем 3 спэцыяльныя вярбовачныя брыгады і даем кожнаму актывісту заданьне—уцягнуць у калгасы па меньш 5-ці бяднацка-сераднацкіх гаспадарак.

Уключаючыся ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту, мы абавязваемся рапартаваць усесаюзнаму зьезду саветаў аб поўнай падрыхтаванасьці калгаса да веснавой сяўбы і ў дні зьезду АРГАНІЗАВАЦЬ ПЕРШЫ ПРОБНЫ ВЫЕЗД У ПОЛЕ.

Калгаснікі «Энгельса» заклікаюць усіх калгаснікаў БССР пайсьці на іх прыкладзе і, уключыўшыся ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту, разгарнуць падрыхтоўку да сяўбы, масавую работу па калектывізацыі і кантрактацыі сапраўды ўдарнымі тэмпамі. КАЛГАСЬНІКІ БССР ПАВІННЫ РАПАРТАВАЦЬ X УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ АБ ВЫКАНАНЬНІ АСНОЎНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ І УСЕСАЮЗНАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ— АБ ПОЎНАЙ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ.

Увесь беларускі друк павінен уключыцца ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту, мабілізуючы масы калгаснікаў і аднаасобнікаў—бяднякоў і сераднякоў—на бальшавіцкае сваячасное выкананьне ўсіх мерапрыемстваў да другой калгаснай вясны.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ «ЭНГЕЛЬС».

Да ведама камісіі выкананьня пры СНК БССР

С.-Г. БУДАЎНІЦТВА— НА СТАНОВІШЧЫ БЯСПРЫТУЛЬНАГА

ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА БУДАЎНІЦТВА НЕ АДПАВЯДАЮЦЬ УЗЯТЫМ ТЭМПАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Недагаворанасьць паміж арганізацыямі, бюракратызм і цяганіна пагражаюць сарваць сэзон

«Зьвязда» пачала праверку падрыхтаванасьці да с.-г. будаўніцтва са скліканьня пры рэдакцыі спэцыяльнае нарады кіраўнікоў вацкаўленых с.-г. і будаўнічых арганізацый.

На с.-г. будаўніцтва ў БССР у бягучым годзе асыгнуецца жыла 70 мін. рублёў, з якіх 30 мін. рублёў прыпадае на Белсельбуд, які зьмяшчэна асноўная будаўнічая арганізацыя. На Белсельбуд усклаецца самае адказнае і важнейшае будаўніцтва па лініі зьдзяйсьняў усесаюзных с.-г. трастаў—МТС, Сыпнавод, Насоснавод, Маслатрэст—і часткова па сяўбасах Белсельтрэсту.

Згодна паміж Белсельбудам і вышэйшымі не заключаны, за выключэньнем Насоснаводтрэсту і Белсельтрэсту. Прычына — Трактарацэнтр, Сыпнавод і Маслатрэст ніяк не могуць дакладных тыпуальных сьпісаў.

Белсельбуд ня можа разгарнуць работы па будаўніцтве МТС (кажа з мін. рублёў)—з тае прычыны, што Трактарацэнтр увесь час мяняе свае тыпуальныя сьпісы. На працягу 2-х тыдняў ён прадставіў тры розных сьпісы і кажэце — канцэрты, якім сакоўваюцца ўсе раней прадпісаныя. Цяпер нікай упэўненасьці, што апошні сьпіс выдзяляецца канчаткоўным. Зусім разумела, што, на ведамы аб'ектаў будаўніцтва, кемгачыя адвесьці вучасткі. Да гэтага часу вучасткі пад будоўні адведзены толькі ў пяцітарых МТС у той час, як будаваць павінны 23 МТС. Такое становішча выклікае сустрэчныя перапоны будаўнічых матар'ялаў, якія ажыраўваюцца МТС. Пашэ будаўнічых матар'ялаў дзе неадпавяднічча. Дырэктары МТС ня здолелі мабілізаваць увагі калгаснікаў на бавое выкананьне гэтай задачы. Да МТС падведзена ня больш 10 проц. закарманных пасеньняў.

Слабы тэмп выявіў Трактарацэнтр апрадзе тым, што, паводзе дагавору з Сакозсельбудам, аб выкананьні павінен клапаціцца Белсельбуд. Калі нават такая умова ёсьць у дагаворы паміж Сакозсельбудам і Трактарацэнтрам, дык ра умовах Беларусі яна нерэальна. Белсельбуд пакуль ніяк ня мае свайго транспарту. Тыпы чынам, выкананьне плану вывазкі матэрыялаў тормаз тэмпы ў тым выпадку, калі да гэтай справы будзе прыцягнуты калгасны транспарт. Між тым, МТС слабо прыцягваюць калгасы, лічачы, што пакуль адказнасьць за вывазку ляжыць на Белсельбудзе, дык бо, гаворыцца чынам, і гэтымі клапаціцца ня гэтыя.

Самае вялікае месца ў будаўнічай праграме Белсельбуду вакуе Сыпнавод—на 17 мін. рублёў. Сыпнавод ніяк ня ведае, што і дзе ён будзе будаваць. Беларуская канцора Сыпнавода такіх тыпуальных сьпісаў в Маскве. Белсельбуд адмовіўся ўзяць на сябе будаўніцтва ў 10 сыпнаводчых сяўбасах, фактычна з тае прычыны, што яны знаходзяцца на далёкай адлегласьці ад чыгуначных станцый. Паводле дагавору паміж Сакозсельбудам і Сыпнаводам Белсельбуд ня мае права адмовіцца ад будаўніцтва. У гэтых сяўбасах, за выключэньнем аднаго, кошт будаўніцтва ў якім складае менш 50 тыс. рублёў.

Зусім незадавальняюча ідзе падвоз матэрыялаў, які павінны былі арганізаваць дэпартамэнты. Фармальна за падвоз адказвае Белсельбуд. Аднак, яго работнікі на месцах не аддаюць гэтай справе належнай увагі і не выяўляюць патрабных зацікаўленасьці. Цэнтр гледжаньня праграбаў такі: кое павінны вазіць дэпартамэнты, кое патрэбон сяўбасам—ніякай і тыя і другія клапоцца аб гэтым. Дэпартамэнты, аднак, кажуць, што ім ня ведамы ні аб'ектаў, ні тэрміны іх выкананьня. Белсельбуд, у сваю чаргу, кажа, што ён ня ведае, дзе і колькі будаваць, і ня можа дакладна ўлічыць, колькі ён будзе вазіць матэрыялаў і на падвозіць і в гэтае прычыны Сыпнавод сам увяўся ва справу. Усіх сяўбасам запрапанавала пацыца вывазкай лесу, аднак, толькі 10 проц. сяўбасіх гаспадарак прынялі гэты загад да выкананьня. Рэшта сяўбасаў працуе алімпійскі спосаб. Рынкі даводзі мінерыны—з адпушчаных па нарадах на першы квартал 1931 году 60 тыс. кубаметраў з пясу на вывазка ні адзінаго кубу. Фактычна ніяк не рэалізаваны нарад особнага пацыцыу: з 35 тысяч кубаметраў вывезена толькі пяць 5 тыс.

У выніку нерасчарадзкасьці апарату Белсельбуду, непрадстаўленьня заказчыкамі тыпуальных сьпісаў (аскіцкова было—хто, што і дзе будзе будаваць)—яму месца наступны абурыўны факт. Сакозсельбуд вылучыў Белсельбуду патрэбны фонд лесоматэрыялаў і студзеня 1931 году—у колькасьці 30 тыс. кубаметраў і 11 студзеня — 75 тыс. кубаметраў. Размеркаваньне матэрыялаў зацягнулася ў Белсельбудзе да 26 студзеня, з нарадаў былі разасланы на месцы толькі 2 гэкта. Такім чынам, цэлы месяц — студзень—быў зусім упушчаны для выканні. Нагадзім чыну рад будаўніцтваў на месцах ніяк гэтых нарадаў не атрымалі.

Арганізацыі дапускаюць выключны разгавор у вызначэньні самога кошту будаўніцтва. У той час, як адна ўстанова вызначае кошт кубаметру ў 83 рублі, другая ніша—67 руб., а трэцяя—3 рублі (!)—на прыблізна адпаўдзіцца аб'екты.

Яўна неадпавядняя ідзе загатоўка насоўных матэрыялаў. Гэты, напрыклад, загатоўлена 2,5 проц. патрэбнасьці. У сувязі з нецадвозкай лесу пачаткі не працуюць. Цэгла, цэмэнт і вапна ніяк не размеркаваны Дзяржпланам. Цьвікоў адпушчана толькі 2,5 проц. патрабаваньня. У цэнтралізаваным парадку адпушчана кала 70 проц. патрэбы круглага лесу і толькі 10 проц.—пілёнка. Гэта ставіць будаўніцтва ў ціяжкае становішча, бо прыдзецца арганізоўваць расьпіхоўку сямі будаўнічым арганізацыям.

У самым небясьпечным становішчы—падрыхтоўка да сяўбасных будаўніцтва. Абласта у БССР будзе будавацца кала 100 сяўбасных вежаў, між тым, гэта амаль выпала з-пад увагі зацікаўленых арганізацый. Да будаўніцтва вежаў ніхто ня рыхтуецца. Каб не сарваць гэтай важнай справы неабходна зараз-жа прыцягнуць да падрыхтоўкі хапа-б 100 інструктароў, арганізаваць спэцыяльны кансультацыю.

Белсельбуд, ўлічваючы, што выкананьню праграму, накіраваную супроць мінулага году на 200 проц., пакуль стаўрыні штадамі работы, зараз рэарганізуе свой апарат. Замест мнуглых мастэр-стварэцца 20 будаўнічых вучасткаў. На кожны вучастак прыпадае будаўніцтва коштам на нагтара-дзе мільёны рублёў пры ніякай раскладзенасьці абкетаў. Аднак, фактычна гэта рэарганізацыя пакуль ня можа быць зажыцьцёўлена з-за адсутнасьці кадраў. Пакуль укамплектавана толькі 7 будаўнічых вучасткаў. Не хапае 33 інжынэраў, 155 тэхнікаў. Дасюэтнікаў Белдарбуд рыхтуе на спэцыяльных курсах і атрымае іх толькі ў мае. На сённішні дзень рэальных пэрспэктыў на стрымаўне патрэбнага кваліфікаванага пэрсаналу няма.

Вольмі дрэнна з забесьпячэньнем рабочай сілы інструментарыям. У бліжэйшыя дні Наркамправы павінен даць 3 тысячы чалавек, а на складах Белсельбуду налічваецца толькі 300 сякер.

Ніякай падрыхтоўкі фактычна на гаспадарку на падвозіць і в гэтае прычыны Сыпнавод сам увяўся ва справу. Усіх сяўбасам запрапанавала пацыца вывазкай лесу, аднак, толькі 10 проц. сяўбасіх гаспадарак прынялі гэты загад да выкананьня. Рэшта сяўбасаў працуе алімпійскі спосаб. Рынкі даводзі мінерыны—з адпушчаных па нарадах на першы квартал 1931 году 60 тыс. кубаметраў з пясу на вывазка ні адзінаго кубу. Фактычна ніяк не рэалізаваны нарад особнага пацыцыу: з 35 тысяч кубаметраў вывезена толькі пяць 5 тыс.

У выніку нерасчарадзкасьці апарату Белсельбуду, непрадстаўленьня заказчыкамі тыпуальных сьпісаў (аскіцкова было—хто, што і дзе будзе будаваць)—яму месца наступны абурыўны факт. Сакозсельбуд вылучыў Белсельбуду патрэбны фонд лесоматэрыялаў і студзеня 1931 году—у колькасьці 30 тыс. кубаметраў і 11 студзеня — 75 тыс. кубаметраў. Размеркаваньне матэрыялаў зацягнулася ў Белсельбудзе да 26 студзеня, з нарадаў былі разасланы на месцы толькі 2 гэкта. Такім чынам, цэлы месяц — студзень—быў зусім упушчаны для выканні. Нагадзім чыну рад будаўніцтваў на месцах ніяк гэтых нарадаў не атрымалі.

Арганізацыі дапускаюць выключны разгавор у вызначэньні самога кошту будаўніцтва. У той час, як адна ўстанова вызначае кошт кубаметру ў 83 рублі, другая ніша—67 руб., а трэцяя—3 рублі (!)—на прыблізна адпаўдзіцца аб'екты.

Яўна неадпавядняя ідзе загатоўка насоўных матэрыялаў. Гэты, напрыклад, загатоўлена 2,5 проц. патрэбнасьці. У сувязі з нецадвозкай лесу пачаткі не працуюць. Цэгла, цэмэнт і вапна ніяк не размеркаваны Дзяржпланам. Цьвікоў адпушчана толькі 2,5 проц. патрабаваньня. У цэнтралізаваным парадку адпушчана кала 70 проц. патрэбы круглага лесу і толькі 10 проц.—пілёнка. Гэта ставіць будаўніцтва ў ціяжкае становішча, бо прыдзецца арганізоўваць расьпіхоўку сямі будаўнічым арганізацыям.

У самым небясьпечным становішчы—падрыхтоўка да сяўбасных будаўніцтва. Абласта у БССР будзе будавацца кала 100 сяўбасных вежаў, між тым, гэта амаль выпала з-пад увагі зацікаўленых арганізацый. Да будаўніцтва вежаў ніхто ня рыхтуецца. Каб не сарваць гэтай важнай справы неабходна зараз-жа прыцягнуць да падрыхтоўкі хапа-б 100 інструктароў, арганізаваць спэцыяльны кансультацыю.

Белсельбуд, ўлічваючы, што выкананьню праграму, накіраваную супроць мінулага году на 200 проц., пакуль стаўрыні штадамі работы, зараз рэарганізуе свой апарат. Замест мнуглых мастэр-стварэцца 20 будаўнічых вучасткаў. На кожны вучастак прыпадае будаўніцтва коштам на нагтара-дзе мільёны рублёў пры ніякай раскладзенасьці абкетаў. Аднак, фактычна гэта рэарганізацыя пакуль ня можа быць зажыцьцёўлена з-за адсутнасьці кадраў. Пакуль укамплектавана толькі 7 будаўнічых вучасткаў. Не хапае 33 інжынэраў, 155 тэхнікаў. Дасюэтнікаў Белдарбуд рыхтуе на спэцыяльных курсах і атрымае іх толькі ў мае. На сённішні дзень рэальных пэрспэктыў на стрымаўне патрэбнага кваліфікаванага пэрсаналу няма.

Вольмі дрэнна з забесьпячэньнем рабочай сілы інструментарыям. У бліжэйшыя дні Наркамправы павінен даць 3 тысячы чалавек, а на складах Белсельбуду налічваецца толькі 300 сякер.

Ніякай падрыхтоўкі фактычна на

У ДНІ УСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ АРГАНІЗУЙЦЕ ПРОБНЫЯ ВЫЕЗДЫ У ПОЛЕ. ПАКАЖЭЦЕ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ

Калгас імя Менгаркому КП(б)Б высунуў сустрэчны плян

Прыгарадны калгас імя Менгаркому КП(б)Б узмоцнена рыхтуецца да другой бальшавіцкай вясны. Калгас цалкам прыняў вызначаны райкалгасаюзам плян засеву гародніны на 60 гэкт. і высунуў свой сустрэчны плян павялічэньня пасеваў на 10 проц. Поўнасьцю адрамантаваны інвэнтар, складзены насоўныя і страхавыя фонды па галяводчых культурах.

У мэтах лепшай падрыхтоўкі да правядзеньня вясновай сяўбы калгаснікі выклікалі на сацспаборніцтва калгас імя Дзяржынскага. Усю работу на калгасе пастаноўлена перавесьці па брыгадзе, па кольнасьці і якасьці працы. Калгаснікі абавязаліся канчатова зьнішчыць прагулы, павысіць працдысцыпліну і выканаць аграмінімум.

МІЦЕЛІЦА.

Слуцкія калгаснікі абвясьцілі сябе мабілізаванымі на барацьбу за прыліў

«Бялвому органу, які мабілізуе масы на ўдарныя сацыялістычныя тэмпы будаўніцтва, за рашучае праведзеньне генаральнай лініі партыі, на бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам, «левым» загібам і прымірэнцтвам — бальшавіцкай «Зьвязьдзе» ад 1 раённага зьезду калгаснікаў Случчыны шчырае прывітаньне. Пацьвярджаючы правільнасьць перадавіцы «Зьвязды» ад 11 лютага (№ 40), дзе правільна падкрэсьлівецца адставаньне Случчыны ў росьце калгасаў, зяўляюм, што калгасы Случчыны, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, будуць энэргічна біцца за ліквідацыю прарыву у калгасным будаўніцтве, за выкананьне плянаў другой бальшавіцкай вясны, рашуча адмятаючы апартуністычную стаўку на самацёк. Зьезд абвяшчае сябе мабілізаваным на разгортваньне арганізацыйна-масавай работы па вярбоўцы ў калгасы батраноў, бяднацка-сераднацкіх мас сялянства раёну.

Няхай жыве КП(б)Б — арганізатар і кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва. Няхай жыве яго баявы бальшавіцкі орган «Зьвязда».

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ».

У Чэрвеньскім раёне адозва аб кантрактацыі пакладзена пад сукно

ЧЭРВЕНЬ. З моманту апублікаваньня адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі кравых прайшло ўжо нескалькі тыдняў. Аднак, у Чэрвеньскім раёне да гэтага часу нічога прадпрыняцтва ня зроблена для папулярызацыі і рэвальвацыі адозвы. Гэты важнейшы палітычна-гаспадарчы дакумант у большасьці партыйных і камсамольскіх ячэек ляжыць ня прапрацаваны і не папулярызаваны сярод мас калгаснікаў і бяднякоў і сераднякоў—адзіаасобнікаў.

Асабліва дрэнна пастаўлена работа у Рэвяцкім, Грабянецкім і Лядзенскім сельсаветах.

Толькі у адным кар'ерэйцы Пагодзінскага сельсавету прапрацоўка адозвы дала ўжо станоўчыя вынікі. Ячэйка прымацавала пасобных таварышоў да пасовальных пунктаў для правядзеньня гэтай работы. У вёсцы Педарэўск, у зьвязку з прапрацоўкай адозвы арганізавана індывідуальная група па вярбоўцы ў калгас.

Многія раённыя арганізацыі, як райкалгасаюз і райкамсаюз, якія непасрэдна праведзець кантрэктацыю, ня прынялі ніякіх мер да рэалізацыі адозвы.

Я.

Усебеларуская нарада калгаснікаў ільнаводчых раёнаў

У мэтах узмацненьня тэмпу апрацоўкі і здачы ільнавалакна, а таксама абгаварэньня мерапрыемстваў па выкананьні плянаў засеву, догляду, ўборкі і апрацоўкі тэхкультур у 1931 годзе, 24-га лютага ў Віцеб

Барацьба за фінплян — барацьба за пяцігодку

БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР АПАРТУНІСТЫЧНЫМ СПРОБАМ АДДЗЯЛІЦЬ МАБІЛІЗАЦЫЮ СРОДКАЎ АД ІНШЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ РАЗГОРНУТАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ

Аднаразовы збор — на бальшавіцкія тэмпы. Неадкладна спагнаць усе плацяжы з кулацка-заможных элемэнтаў

Спажывецкая кааперацыя БССР ганебна адстае ў мабілізацыі сродкаў

Студзеньскі плян паянакапленьня выканан толькі на 56,1 проц.

Спажывецкая кааперацыя БССР за апошнія два гады дабілася значных посьпехаў у мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Калі на 1-га студзеня 1929 г. сродкі насельніцтва (паі, укłады, авансы) займалі ў балянсе сыстэмы Белкаапсаюзу 11,6 проц., дык на 1-га студзеня 1931 г. удзельная вага іх павялічыцца да 37,6 проц., г. зн., што роля прыцягнутых сродкаў насельніцтва, як крыніцы фінансаваньня тавараабароту, павялічыцца ў тры разы.

Заданьне Цэнтрасаюзу па зборы паёў на асобны квартал у суме 5.678 тыс. руб. было павялічана СНК БССР да 6.800 тыс. руб. і выканана сыстэмай у разьмеры 6.100 тыс. руб. (88,9 проц.), прычым гарадзкая сетка перавыканала свой плян на 30 проц., вясковая-ж недавыканала плян на 18 проц. Побач са спажыўтаварыствамі, якія заданьні асобнага квартału перавыканалі (Коханаўскае, Лёзьненскае, Дуброўенскае, Багушэўскае, Плешчаніцкае, Полацкае, Расонскае, Тураўскае і інш.), рад спажыўтаварыстваў ганебна праваліў збор паёў у гэтым кварталe (Веткаўскае — 55 проц., Гарадоцкае — 54 проц., Журавіцкае — 54 проц., Кармянскае — 34 проц., Клічаўскае — 48 проц., Крычаўскае — 40 проц., Нараўлянскае — 45 проц. і інш.).

Весткі аб ходзе выкананьня плану першага кварталу бягучага году сьведчаць аб пэўным прарыве на фронце назначаньня: студзеньскі плян выканан толькі на 56,1 проц., прычым у той час, калі па гарадзкой сыстэме выкананьне плану больш-менш здавальняючае (95 проц.), пагроза прарыву асабліва рэзка праявілася на вясковым сэктары, дзе сабрана ўсяго... 40 проц. заданьня.

Ганебнае зьніжэньне тэмпаў паянакапленьня ярка сьведчыць, што скарыстаньне адных толькі мэтадаў так званай «матар'яльнай зацікаўленасьці» зусім неэфэктыўна для выкананьня баявых задач на зборы сродкаў. Большасьць кааперацыйных работнікаў ніяк не ўявіла сабе, што мабілізацыя сродкаў пайшчыкаў павінна быць пастаўлена як работа грамадзка-масавага значэньня з прыцягненьнем усяго кааперацыйнага актыву і скарыстаньнем такіх мэтадаў, як сацспаборніцтва, грамадзкі буксір, сустрэчны фінплян.

З другога боку неабходна адзначыць, што пасьпяховасьць збору паёў знаходзіцца ў простай залежнасьці ад выкананьня заданьняў па каапераваньні пайшчыкаў. Між тым, даныя аб ходзе гэтай работы зусім незадавальняючыя і не адпавядаюць тым вялікім заданьням, якія зацьверджаны ў кантрольных лічбах на 1931 г. Сярод асобных работнікаў кааперацыі ёсьць такія настроі, пібы «усе рэзервы для паянакапленьня ўжо вычарпаны». Па такіх дэмабілізацыйных настроях трэба моцна ударыць.

Другі від сродкаў, якіх прычыняюць удзел у кааперацыйным тавараабароце — гэта лішнія сродкі пайшчыкаў, якія (сродкі) прыцягваюцца ў якасьці ўкладаў. З гэтым відам мабілізацыі сродкаў спажывецкая кааперацыя знаёма ўжо даўно, але сур'ёзных врахаў у гэтай галіне ніяк няма. За апошнія два гады астача ўкладаў хістаецца ў разьмерах 500-600 тысяч рублёў, а ў апошні час паказвае нават зьніжэньне. Трэба сказаць, што пры належнай пастаноўцы работы магчымасьці прыцягненьня ўкладаў, асабліва па вясковай сыстэме спажывецкай кааперацыі, вялізарнейшыя.

Амаль усе кааперацыйныя арганізацыі на месцах недаацэньваюць значэньня прыцягненьня ўкладаў і, асабліва, дробных. Амаль ні ў адной краме спажывецкай кааперацыі ня відаць навать звычайнага плякату, або лёзунгу адпаведнага зьместу, апарат належнымчынам не праінструктаваны і часта зусім ня хоча займацца гэтай справай. Значная частка віны за невыстарчальнасьць ущагненьня ўкладаў прыпадае на Белкаапсаюз, які аддае гэтай справе вельмі мала ўвагі.

Авансавыя апэрацыі да гэтага часу не набылі ў рабоце спажывецкай кааперацыі пастаяннага характару і праводзіцца выпадкова, ад часу да часу. У самым Белкаапсаюзе ў тым пытаньні да апошняга часу была недапушчальная блытаніна: фінансавы сэктар дае пісьмовы загаворы на зборы авансаў па тавары, а сэктар забесьпячэньня ў той-жа час дае дырэктыву... аб спыненьні прыёму авансаў. Толькі 17-га студзеня праўленьнем БКС была прынята пастанова, паводле якой авансавыя апэрацыі ўводзяцца, як пастаянны мэтад работы па ўцягненьні сродкаў каапераванага насельніцтва.

Шпаркі рост тавараабароту за апошнія гады, новыя задачы па абслугоўваньні працоўных мас, ускладзеныя на спажывецкую кааперацыю, усё больш выдзяляюць невыстарчальнасьць матар'яльна-тэхнічнай базы сыстэмы Белкаапсаюзу (крамы, сталоўкі, хлебапякарні, сховы для гародніны і г. д.), а часам і поўнай яе адсутнасьці, у асабліваści на новых галінах работы. У зьвязку з гэтым усё больш узрастае неабходнасьць перабудовы ўсёй матар'яльна-тэхнічнай базы на новых сацыялістычных падставах. З радосьцю кааперацыйнага актыву высоўваецца зусім правільная думка аб неабходнасьці прыцягненьня сродкаў пайшчыкаў у янасьці доўгатэрміновых (да 5 год) мэтавых укладаў у спажывецкую кааперацыю на будаўніцтва. Некаторыя кааперацыйныя арганізацыі ўжо маюць у гэтай галіне значныя посьпехі. Як правіла, мэтавы ўзносы на будаўніцтва устанаўліваюцца ў разьмеры 25-30 проц. да дыфэрэнцыяванага паю. На 1-га лютага 1931 г. гэтыя ўзносы ў сыстэме Белкаапсаюзу складаюць каля 1.800 тыс. руб., сабраных, у асноўным, па вясковай сетцы. Ня кледзячы на больш, чым гадовую практыку доўгатэрміновых укладаў, некаторыя арганізацыі нават не прыступілі да збору гэтых сродкаў (Жыткавіцкае, Клічаўскае, Парыцкае, Сьмілавіцкае, Чырвона-Спадобнае раённыя спажывецкія таварыствы). Гарадзкія ЦРК пачалі толькі ў апошнія месяцы разварушыліся (сабрана ўсяго 166 тыс. руб.), а такія буйныя адзінкі, як Менскі і Гомельскі ЦРК, да гэтага часу яшчэ не прыступілі да збору мэтавых узносаў на будаўніцтва.

Зусім яшчэ ня вывучана практыка некаторых арганізацый (гарадзкіх) па прыцягненьні сродкаў шляхам выдачы пайшчыкам абанэмэнтаў за больш-менш пастаянныя паслугі (абеды ў сталоўках і г. д.). Між тым пры належнай пастаноўцы гэтай работы можна атрымаць вельмі добрыя вынікі. Па арыентовачных меркаваньнях, па адным Гомельскім ЦРК, напрыклад, пастаянная астача такіх сродкаў складае каля 100 тыс. руб.

У заключэньне трэба сказаць, што ў галіне мабілізацыі сродкаў насельніцтва зваталося яшчэ шмат чаго зрабіць, як на лініі адміністрацыйнай, так у асноўным і, галоўным чынам, на пераключэньні на сапраўды сацыялістычныя грамадзка-масавыя мэтады работы. Толькі пры разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, грамадзкага буксіру і сустрэчнага фінплану, пры ўмове ўцягненьня ў справу мабілізацыі сродкаў усяго кааперацыйнага актыву, — мы здолеем выканаць задачы, якія пастаўлены перад спажывецкай кааперацыяй партыяй і ўрадам.

Д. Р-э.

Неадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы

На 10 лютага паступіла толькі 20 проц. збору

Даныя аб ходзе кампаніі па аднаразовым зборы прымушаюць біць трывогу. Рэалізацыя закону ўраду ў большасьці раёнаў БССР ідзе недапушчальна дрэнна. Вось лічбы, якія гавораць самі за сябе.

На 10 лютага па 74-х раёнах паступіла аднаразовага збору 1.155.600 руб., АБО... 20 ПРОЦ. НАЛІЧАНАЙ СУМЫ.

Аб спагнаньні збору з кулакоў весткі ёсьць толькі з 42-х раёнаў. Па гэтых раёнах у сярэднім паступіла ўсяго 10,1 проц. налічанай з кулакоў сумы. Між тым, паводле закону ўжо да 10 лютага павінна было паступіць 70 проц. усяго збору, а з кулакоў трэба было спагнаць усе 100 проц. яшчэ да 1 лютага.

Пагроза зрыву кампаніі тлумачыцца апартуністычнай недаацэнкай аднаразовага збору з боку мясцовых арганізацый, у прыватнасьці райфінаддзелаў і сельсаветаў. Мясцовыя арганізацыі не аддаюць гэтай кампаніі належнай увагі. Агітацыйна-растлумачальная работа сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў - аднаасобнікаў не праводзіцца. Апартуністы з раду райфінаддзелаў і сельскіх саветаў спадзяюцца выключна на самацёк і сядзяць склаўшы рукі. Яны чакаюць пакуль кулак добраахвотна прынясе ім налічаныя на яго сумы, забыўшы аб рашучым наступленьні на кулака, аб жорсткім адпоры кулацкаму сабатажу.

Толькі махровым бюракратызмам, апартуністычнай бязьдзейнасьцю фінорганаў можна растлумачыць такі факт, што 17 раёнаў (КОПЫСКІ, КОХАНАЎСКІ, МСЬЦІСЛАЎСКІ, РАСЬНЯНСКІ, РАГАЧОЎСКІ, ЛОЕЎСКІ, УВАРАВІЦКІ, ЦЕРАХАЎСКІ, БЫХАЎСКІ, КАРМЯНСКІ, ЧЭРЫКАЎСКІ, ЖЫТКАВІЦКІ, БЯГОМЛЬСКІ, КАРАЛІНСКІ, ГРЭСКІ, СМАЛЯВІЦКІ і БОРКАВІЦКІ) да гэтага часу не паведамілі аб ходзе кампаніі па аднаразовым зборы. Рад раёнаў не прадставіў вестак аб тым, колькі паступіла збору на 10 лютага, ці не паказалі колькі спагнана з кулакоў. Рэкорд бюракратызму пабілі ЧАЧЭРСКІ і ВУШАЦКІ раёны, якія, ня гледзячы на цэлы рад тэлеграм, не паведамілі, нават, ці скончана перадача паведамленьняў платнікам.

Добры прыклад паказаў СІРОЦІНСКІ раён, дзе на 10 лютага сабрана 61,7 проц. налічанай сумы. У гэтым раёне ванол аднаразовага збору, мабілізавана ўся ўвага, разгорнуты сапраўды баявыя тэмпы.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў ходзе кампаніі. Да скончэньня тэрміну правядзеньня кампаніі засталося 2 дэкады. За гэты час трэба дабіцца поўнага выкананьня намечаных заданьняў, поўнага збору налічаных сум. Раённыя органы, якія нядбайна адносяцца да рэалізацыі закону ўраду, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. Правядзеньне аднаразовага збору—праверка баяздольнасьці партыйных і савецкіх органаў. У залежнасьці ад выкананьня ці невыкананьня тэзіс ці іншай мясцовай арганізацыяй сваіх заданьняў можна будзе меркаваць аб усёй рабоце данай арганізацыі.

Аднаразовы збор павінен быць праведзен на сапраўды баявыя тэмпы.

Чорная дошка

раёнаў, якія ганебна праваліваюць аднаразовы збор.

РАЁН:	% выкананьня заданьня на 10-II.
Касьцюковіцкі	3,3
Межанскі	3,7
Прапойскі	4,4
Бабруйскі	5,4
Круглянскі	8,1
Чырвонапольскі	10,1
Асьвейскі	10,3
Камарынскі	10,8
Азарыцкі	11,3
Барысаўскі	12,4
Хоцімскі	12,6
Бешанковіцкі	13,8
Чэрвеньскі	13,9

Усебеларуская нарада па арганізацыі працы ў калгасах

Вопыт лепшых калгасаў мабілізуем на выкананьне задач 3-га году пяцігодкі

Даклады калгасу „Энгельс" і камуны імя БВА

12-га лютага пры Калгасцэнтры БССР адкрылася першая Усебеларуская нарада па арганізацыі працы ў калгасах.

На нараду зьявіліся прадстаўнікі 16 райкалгасаюзаў, 6 калгасаў, адной МТС, цэнтральных і навукова-дасьледчых устаноў.

Нараду адкрыў пам. старшыні Калгасцэнтру БССР тав. Стрэле, які застанавіўся на дасягненьнях калгаснага руху ў БССР.

— На 1-га лютага па БССР налічваецца 4.367 калгасаў, якія яднаюць больш 16 проц. бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. Сярэдні разьмер аднаго калгасу па зямельнай плошчы — 400 гэкт. Калгасы ў першую бальшавіцкую вясну на толькі заралі зямлі, якія належылі калгасьнікам, але значна пашырылі пасеўны клін за лік раскарчоўкі і распашні.

Ураджайнасьць калгасных палёў на 20 проц. вышэй ураджайнасьці аднаасобных гаспадарак. На 1-га студзеня жывёлагадоўчыя калгасныя фэрмы былі ўкамплектаваны **40 тыс. кароў.** Сьвінагадоўчыя калгасы налічваюць **31,500 сьвінаматак.**

Далей тав. Стрэле спыняецца на прарывах, якія былі ў радзе калгасаў у часе ўборачнай кампаніі. Грубейшыя памылкі былі дапушчаны ў радзе калгасаў пры разьмеркаваньні ўраджаю. Бамест таго, каб захоўваць працоўны прынцып пры разьмеркаваньні ўраджаю, дапускалася разьмеркаваньне па едакох.

Пераходзячы да пытаньняў арганізацыі працы ў калгасах, дакладчык адзначае, што ў гэтай галіне існуе блытаніна. Мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах яшчэ не замацаваны. **Толькі 26,7 проц. усіх калгасаў ахоплены сацыялістычным спаборніцтвам, 29,9 проц. калгасаў маюць ударныя брыгады.**

Цьвёрдыя нормы выпрацоўкі і зьдзельшчына вельмі слаба прышчапляюцца ў калгасах. Толькі ў 40 проц. калгасаў ёсьць цьвёрдыя нормы выпрацоўкі. Зьдзельшчына ўжываецца толькі ў 10 проц. усіх калгасаў.

Няма нападжанага першаначатковага ўліку працы ў калгасах. У радзе калгасаў наглядаецца нізкая працоўная дысцыпліна. Трактары і с.-г. машыны часта выкарыстоўваюцца нерацыянальна.

Першая Усебеларуская нарада па арганізацыі працы ў калгасах павінна запяцца вырашэньнем усіх гэтых пытаньняў. Нарада павінна бязьлітасна выкрыць усе недахопы па арганізацыі працы ў калгасах. Улічваючы прыклады лепшых калгасаў, нарада павінна намеціць практычныя мерапрыемствы па паляпшэньні арганізацыі працы.

Нарада пераходзіць да заслухоўваньня дакладу аб арганізацыі працы ў лепшых калгасах.

Першым выступае **старшыня калгасу імя Энгельса (Уваравіцкі раён), тав. Федарэнка.**

Калгас арганізаваўся ў красавіку 1930 г. Пасьля канчаткова арганізацыі і афармленьня ў калгасе засталося 214 двароў з плошчай 2.800 гэкт.

Уся работа па правядзеньні веснавой сяўбы і ўборкі праводзілася пад пэўнага ударніцтва. Калгасам быў заключан дагавор на сацспаборніцтве з фабрыкай «Камінтэрн» у Гомелі на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы. **Гэты дагавор калгасьнікамі поўнасьцю быў выкананы.**

Ударніцтва і сацспаборніцтва значна павысілі інтэнсыўнасьць працы ў калгасе. Так, радавыя сявяркі раней засявалі 2 гэкт., а пасьля заключэньня сацдагавору 3,25 проц. гэкт. На ўборцы бульбы на адным гэктары працавала 24 чал., пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны — 14 чал. Паводле плану, для ўборкі 175 гэкт. бульбы было вызначана 4.200 працоўных дзён. Пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны бульба была выкапана ў 2.450 працоўных дзён.

Разьмеркаваньне ўраджаю праводзіцца па працоўных днёх. У разьмеркаваньні было прадугледжана таксама забесьпячэньне непрацаздольных.

Далей тав. Федарэнка спыняецца на надрыхтоўцы калгасу да веснавой сяўбы. Калгас імя Энгельса ўжо заканчвае есьцку насенных фондаў і рамонт сельска-гаспадарчых машын. Калгасьнікі снардзяцца на дрэнную якасьць запасных частак да с.-г. машын.

— Я лічу, — заканчвае свой даклад тав. Федарэнка, — што зьдзельшчына ў калгасах зьяўляецца асноўным мэтадам правільнай арганізацыі працы. Калгасьнікі пераканаліся, што зьдзельшчына выводзіць з калгасаў гультаёў, устанавлівае правільныя нормы працы. У бягучым годзе мы павінны дабіцца 100-процантнай зьдзельшчыны ва ўсіх галінах работы калгасаў.

З дакладам аб рабоце **камуны імя БВА** (Любаньскі раён) выступіў старшыня камуны тав. **Модзін.**

Камуна БВА арганізавалася ў восень 1929 г. на асушаных Мар'інскіх балотах. Камунары ў большасьці — былыя чырвонаармейцы. Камуна арганізавалася на месцы, дзе раней ня было ніякіх пабудоў. Першы год работы быў скарыстан на арганізацыю гаспадаркі. **За гэты час камуна дабілася вялікіх посьпехаў.** Усе камунары разьбіты на 19 брыгад. 18 брыгад прымацаваны да пэўных галін працы і адна брыгада накіроўваецца ў месцы, дзе патрэбна дадатковая рабочая сіла. Кожная брыгада вылучае старшага брыгадзіра, які атрымлівае нарады ад савету камуны. Атрыманыя нарады абмяркоўваюцца на вытворчых нарадах брыгады. Кожная брыгада мае цьвёрды плян работы. Паміж брыгадамі заключаны дагавары на сацыялістычным спаборніцтве. **Зараз уся камуна абвясьціла сябе ударнай. Уся работа камуны перайшла на зьдзельшчыну. Выгаднасьць зьдзельшчыны паказвае наступны факт. Да ўвядзеньня зьдзельшчыны трактар вывозіў толькі 1.000—1.500 цаглін, зараз — 6.000.**

Сярод камунараў, калі ўводзілі зьдзельшчыну, былі разважаньні аб тым, што мы загонім коняй, што машыны пры зьдзельнай рабоце будуць зломаны. За ўвесь час мы ня маем ні аднаго факту, калі-б машына, або конь пацярпелі ад увядзеньня зьдзельшчыны.

Грамадзянасьць камуны праз насьценгазэту і вытворчыя нарады пільна сочаць за выкананьнем заключаных дагавораў па сацспаборніцтве і ўзятых абавязацельства па ўдарніцтве.

Паведамленьні

Зьмяшчаючы ніжэй сьпіс таварышоў, партыкалегія ЦККК КП(б)В просіць памянёных таварышоў зараз-жа паведамі ць у партыкалегію сваё месца знаходжаньня, месца працы і жыцьлёвы займае пасалу. Просьба да ўсіх ячэек і РК КП(б)В тэрмінова з свайго боку даць такія-ж весткі ў партыкалегію: Трышкін Грыгорый Аляксееў, Цыпцат Люцій Іванаўна, Ельяшэвіч Фёдар Якаўлеў, Морхаёў Залман Рувімаў, Малішкін Нікіфар Грыгор'еў, Малаковіч Антон Канстрат'еў, Коласаў Кузьма Барысаў, Шоўчык Уладзімер Данілаў, Раманенка Ефім Нікалаеў, Маліноўскі Нікалай Ларыёнаў, Рудзенка Павел Сымонаў, Малышкоўч Нікалай Нікалаеў, Русецкі Эдмунд Сігізмундаў, Федарэнчык Зьмітра Міхаёў, Галонаў Іосіф Абрамаў, Самадураў Сяргей Апанасаў, Сяут Осіп Усьцінаў, Несьцер Сьцяпан Антонаў, Фішар Нісон Барысаў, Максімаў Павел Сямёнаў, Нічэмны Сямён Лазараў, Бароўскі Ільля Ісакаў, Багушэвіч Аляксандар Лаўрэнцьеў, Шнэйдэр Самуіл Нахманаў, Міркін Осіп Саламонаў, Мэзэон Наум Сямёнаў, Казарноўская З. М., Гок Арон Абрамаў, Казлоўскі Міхаль Іванаў, Оцёў Лазар Максімаў, Маліноўскі Нікалай Ларыёнаў, Фалкін Ісак Саламонаў, Праабражэнскі Сяргей Нікалаеў, Грушэўскі Аляксей Панцялееў, Белы Андрэй Іванаў, Сасонка Архаім Сымонавіч, Галкін Даніла Зіноўеў, Туманаў Іван Іванаў, Шчэталаў Грыгорый Зьмітраў, Рапліянская Дора Уладзімераўна, Пухоўскі Аляксандар Фёдаравіч, Рутковскі Мацьвей Лявонаў, Гальперын П. Ю., Кавалёў М. З., Пешчык Сяргей Паўлаў, Івокін Сяргей Іванаў, Казлоў Васіль Пілінаў, Рашэўскі Аркадзі Іванаў, Нікіцін Іван Сідараў, Кротаў Емільян Нікалаеў, Пячатнікаў Сямён Міхаёў, Дуброўскі Уладзімер Сьпірыдонаў (б. Магіл.), Сухадольскі Пётр Іванаў (б. Магілёўск. парт. арг.), Кардашэнка (б. Менскай партарганізац.), Файнгаўз (б. Віцебскай партарганізац.), Ропп (б. Віцебскай партарганіз.), Фэльдман (б. Аршанскай партарганіз.), Катковіч М. Фядотаў (б. Полацкай партарганіз.), Лельчык Ф. А. (б. Мазырскай партарганіз.), Рулеў (б. Бабруйскай партарганіз.), Кушцоў М. П.

П. К. ЦКК КП(б)В выклікае на пасяджэньне ПТ ЦКК (Савецкая, 55, 3-ці паверх, пакой № 18), 20-II—31 г. ад 18½ гадз. наступных т. т.:

Сьмірнова Якуба — Жлобінскай арг., Заводніка Л. М.—Менскай арг., Вострыкава Я. П.—Менскай арг., Кароля М. М. —Чэрвеньскай арг., Юдовіча Л. І.—Менскай арг., Калтаровіча І. Э.—Менскай арг., Чарнагаловаго В. А.—Жыткавіцкай арг., Паторскага П. Р.—Сьмілаўскай арг., Дакука Ц. П.—Менскай арг., Нікановіч Я. Д.—Вузьдзенскай арг., Парыж А. Б.—Менскай арг., Хацкевіча А. Я.—Заслаўскай арг., Пузіка Я. А.—Менскай арг., Энгельса—Менскай арг., Васкабойнікава — Менскай арг., Стракоўскага—Менскай арг., Табачніка—Менскай арг., Дружылоўскага —Менскай арг., Дыменцьева—Менскай арг., Бродзіна—Менскай арг., Табачнікава—Менскай арг., Арцюкевіча Д. Х.—Менскай арг., Шыленка В. Я.—Менскай арг., Сьвірыдовіча М. А.—Менскай арг., Разанава А. Ф.—Менскай арг., Прыпольскага — Менскай арг., Дамброўскага Я. Я.—Менскай арг., Былена М. Т.—Менскай арг., Чаплюка Я. — Менскай арг., Ільюхана—Чэрвеньскай арг., Віхнэса—Менскай арг., Станіскевіча Р. С.—Менскай арг., Сазонава В. С.—Менскай арг., Іванова Д.—Менскай арг., Годжіна А.—Менскай арг., Бараўкова М. М. — Заслаўскай арг., Высіча Т. З. — Менскай арг., Рака А. Я.—Менскай арг., Катлова С. Я. — Чэрвеньскай арг., Траўлька В. Ф.—Пухавіцкай арг., Белкінда В. Ш.—Менскай арг., Паўлаўца В. Т.—Менскай арг., Насевіча М. Х.—Менскай арг., Мачальскага — Менскай арг., Розэнгарта Н. А. — Чэрвеньскай арг.

Праезд выклікаемых за свой кошт. Пажадана прысутнічаньне сакратароў яч. КП(б)Б, на вучоце (г. Менску) якіх лічацца памянёныя т. т.

Умовы прыёму

на паасобныя формы масавага завочнага навучаньня на 1931 год

1. Згодна пастанове ЦК УсеКП(б) ад 16 кастрычніка 1930 г., на інстытут масавага завочнага навучаньня ўскладаюцца задачы арганізацыйнага і праграмна-мэтадычнага кіраўніцтва наступнымі формамі завочнай вучобы:

а) цыклавымі радыёлекцыямі па пытаньнях марксыцка-ленінскай вучобы;

б) завочнай саўпартшколай;

в) завочным Камвузам;

г) завочнымі курсамі партактыву на радыё;

д) завочным камсамольскім універсытэтам.

2. У сувязі з гэтым арганізуюцца наступныя формы завочнай вучобы:

а) завочны Камвуз з кантынгентам прыёму ў 1931 г.—2.000 асоб;

б) завочны камсамольскі універсытэт з кантынгентам прыёму ў 1931 г.—1.000 асоб;

в) завочная саўпартшкола (у Менску пры ЗКС КУБ'у і ў Гомелі пры ЗКС СПШ)—2.000 асоб.

г) рабоча-калгасны універсытэт па радыё—1.000 асоб.

3. Сьпіс прынятых на завочнае навучаньне мандатная камісія рассылае ў належныя раённыя камітэты КП(б)В, якія паведамяюць за работай завочнікаў і прымаюць усе захады да ўтварэньня для іх нармальных умоў завочнай вучобы ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) ад 15 верасьня і 16 кастрычніка 1930 г., а іменна:

а) усе завочнікі павінны мець ня менш трох зусім вольных ад усялякай работы дзён у месяц зьвыш выхадных і ня менш трох дзён у месяц з нагрузкай ня зьвыш 8 гадзін у дзень;

б) усе завочнікі, якія выклікаюцца на ўстановачныя і заключныя курсы-канфэрэнцыі, павінны быць абавязкова адпушчаны партыйнымі арганізацыямі;

в) раённыя партыйныя камітэты павінны дабіцца захаваньня вызначаных кантынгентаў, ні ў якім разе не дапушчаючы адсеву завочнікаў і прымаючы захады да павышэньня тэмпаў і якасьці іх працы;

г) партыйныя камітэты павінны аказваць установам, якія праводзяць завочнае навучаньне, ўсямерную дапамогу ў арганізацыі і наладжаньні работы сеткі раённых аўдыторый, кансультацыйных пунктаў і у скліканьні ўстановачных і заключных курсаў-канфэрэнцый.

Умовы прыёму ў завочны універсытэт

1. Завочны Камуністычны Універсытэт зьяўляецца вышэйшай партыйнай школай у сыстэме масавага завочнага навучаньня і ставіць перад сабою задачу тэарэтычнай і арганізацыйна-практычнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі партыйных кадраў для самастойнай кіруючай работы ў галіне партыйнага, савецкага, прафэсіянальнага, кааперацыйна-гаспадарчага будаўніцтва ў раённым маштабе, кіруючых работнікаў фабрычна-заводзкіх партыйных камітэтаў, буйных вытворчых і саўгасна-калгасных ячэек; кваліфікаваных прапагандыстаў для сеткі партыйнай асьветы і выкладчыкаў грамадзкіх дысцыплін.

2. Завочны Камуністычны Універсытэт зьяўляецца галоўнай суставной часткай завочна-курсавога сэктару Камвузу Беларусі. Скончыўшыя яго прыраўноўваюцца ва ўсіх адносінах да скончыўшых асноўны сэктар Камуністычнага Універсытэту.

3. Поўны курс вучобы ў завочным Камуністычным Універсытэце разьлічан на 3 гады.

Ня маючыя патрэбнай агульна-асьветнай падрыхтоўкі павінны атрымаць яе праз папярэднюю завочную вучобу пры завочна-курсавым сэктары Камуністычнага Універсытэту ў аб'ёме дакамвузаўскай падрыхтоўкі.

4. Усе залічаныя ў завочны Камуністычны Універсытэт павінны быць камандыраваны перад пачаткам вучобы па ўстановачную канфэрэнцыю тэрмінам на 1 дэкаду.

На заключную канфэрэнцыю ў канцы навучальнага году тэрмінам на 2 дэкады выклікаюцца толькі тыя завочнікі, якія здавальняюча прапрацоўваюць устаноўлены завочна-курсавым сэктарам мінімум паводле навучальнага пляну і прышлюць патрэбную колькасьць кантрольных пісьмовых работ.

5. Апрача навучаньня па поўным пляне завочным Камуністычным Універсытэтам дапушчаецца вывучаньне як паасобных дысцыплін, якія ўваходзяць у навучальны плян, так і наступных цыклаў:

а) **Эканамічны цыкль:** эканом. геаграфія, паліт. эканомія, тэорыя савецкай гандлі і эканом. палітыка;

б) **Гістарычны:** гісторыя агульная і гісторыя народаў СССР і гісторыя рэвалюцыйнага руху на Беларусі, гісторыя УсеКП(б) і КП(б)Б, гісторыя Камінтэрну;

в) **Гісторыка - партыйны:** гісторыя УсеКП(б) і КП(б)Б, гісторыя Камінтэрну, ленінізм;

г) **Філёзофскі:** прыродазнаўства, дыялектычны матэрыялізм.

6. Сыстематычна і здавальняюча працуючы па поўным навучальным пляне завочнага Камуністычнага Універсытэту маюць права пераходу ў асноўны Камуністычны Універсытэт пры наяўнасьці згоды з боку райкому КП(б)В і мандатных даных для паступленьня ў асноўны Камвуз.

Пераход ажыцьцяўляецца ў канцы навучальнага году бяз усялякіх іспытаў: з посьпехам скончыўшыя 1-ы курс завочнага Камуністычнага Універсытэту пераходзяць на другі курс асноўнага Камвузу, а скончыўшыя 2-гі курс ЗКУ пераходзяць на 3-ці курс асноўнага Камвузу.

7. У завочны Камуністычны Універсытэт прымаюцца:

а) Члены КП(б)В, якія знаходзяцца на кіруючай партыйнай, савецкай, прафэсіянальнай і кааперацыйна-гаспадарчай рабоце раённага маштабу, а таксама сакратары буйных вытворчых і саўгасна-калгасных ячэек і члены бюро фабрычна-заводзкіх партыйных камітэтаў пры наяўнасьці 2-гадовага стажу кіруючай работы і ня менш 3-х год партстажу.

Члены КП(б)В, якія вядуць прапагандысцкую работу ў сетцы партыйнай асьветы, і выкладчыкі грамадзкіх дысцыплін у школах сацвыху, тэхнікумах і ВНУ — пры наяўнасьці 3-х год партстажу і 2-х год прапагандысцкай работы.

УВАГА: Рабочыя-вылучэнцы і жанчыны-работніцы прымаюцца ў ЗКУ пры наяўнасьці 5-гадовага вытворчага і 2-гадовага партстажу.

б) Члены КП(б)В, не прадугледжаныя пунктамі «а» і «б», — пры наяўнасьці партыйнага стажу ня менш 3-х год і скончыўшыя асноўную ці завочную СПШ.

в) Кандыдаты ў партыю — камсамольцы, якія маюць ня менш 5 год камсамольскага стажу і ня менш 2-х год кіруючай работы на нізкай раённага маштабу ў сетцы камсамольскай асьветы.

8. Жадаючыя паступіць у завочны Камуністычны Універсытэт павінны падаць у мандатную камісію:

а) **камандыровку РК КП(б)Б;**

б) **партыйную характарыстыку і весткі аб апошняй партчыстцы з аднакамі ці не падпадаў таварыш партпаганьням;**

в) **запоўненую і засьведчаную анкету;**

г) **кароткі жыцьцяпіс, засьведчаны партарганізацыяй;**

д) **асабістую заяву з паказаньнем, на якім аддаленьні жадае вучыцца, і дзьве фота-карткі (для засьведчаньня).**

9. Ад паступаючых у завочны Камуністычны Універсытэт патрабуюцца:

а) **веданьне асноўных пастаноў зьездаў, канфэрэнцый УсеКП(б) і КП(б)Б і ўменьне арыентавацца ў бягучых палітычных падзеях;**

б) **веды па гісторыі партыі ў аб'ёме скарочанага падручніка Е. Ярославскага (выд. 1930 г.);**

в) **веды па палітэканоміі ў аб'ёме асноўнай ці завочнай саўпартшкол II ступені;**

г) **пісьменна і літаратурна выкладаць думкі вусна і пісьмова на бел. мове, а таксама ўладаць асноўнымі прыёмамі работы з кнігай, веданьне 4-х арыфметычных дзеяньняў і ўменьне рабіць вылічэньні над адцягненымі і назоўнымі лічбамі.**

10. Устанаўляецца на раёнах наступная раскладка прымаемых у завочны Камвуз у 1931 годзе:

1. Менскі гарком КП(б)В — 200 м.;
2. Віцебскі гарком КП(б)В — 120 м.;
3. Гомельскі гарком КП(б)В — 120 м.;
4. Магілёўскі РК — 80 м.;
5. Аршанскі РК — 80 м.;
6. Бабруйскі РК — 60 м.;
7. Полацкі РК — 60 м.;
8. Мазырскі РК — 40 м.;
9. Барысаўскі РК — 60 м.;
10. Шклоўскі РК — 50 м.;
11. Лепельскі РК — 50 м.;
12. Жлобінскі РК — 40 м.;
13. Горацкі РК — 40 м.;
14. БВА — 100 м.

Усім іншым раёнам дасьцца на 10 месц.

11. Раскладка па кампляктаваньні на завочна-курсавы сэктар Камвузу павінна быць выканана партарганізацыямі ў два тэрміны: да 1-га сакавіка — 50 проц. і да 1-га ліпеня — 50 проц. Пачатак заняткаў другога набору вызначацца на 1-ае верасьня 31 г.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.

Рэктар Камвузу Бел. імя Леніна САЕВІЧ.

Загадчык завочна-курсавога сэктару КУБ'у МАКОЎСКІ.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дарожным дадаткам „Прафух")

На 1 мес.	— 1 р
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., перад гарадзкім абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожай. Кантаранэнтны рахунак выдавецтва № 52|100501 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-ці паверх тэл. 7-31.

ІУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Ваўкіні гумавы фільм справа 13 дзён «ПРАМПАРТЫ». Звыш праграмы ХРОНІКА СЯЮЗКІНО № 1 за 1931 г. Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кінэ-тэатр „Культура" — Новы фільм вытворчасьці Саюзкіно (Трастбеларусьфільм) Сапраўднае жыцьцё. Пач. сэансаў: у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 гад. 20 мін. Каса—5 гадзін

КІНО „Інтэр